ЖЫВЫЯ – ПАКУЛЬ ПАМЯТАЕМ...
6

СЕМ'І І ПЫТАННІ, ЯКІЯ ІХ ХВАЛЮЮЦЬ
МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 КАСТРЫЧНІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 202 (30082)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРОТКА

- «Беллеспаперапрам» плануе павялічыць аб'ёмы экспарту і пашырыць каапераційныя сувязі з Іранам.
- **Беларуска-кітайскую вытворчасць па выпуску гідраўлічных вузлоў створаць у Жодзіне.**
- Сяўбу азімых збожжавых завяршылі ў Віцебскай вобласці.
- **Абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у сямі раёнах Беларусі.**
- Больш за 130 кірмашоў прайшло з 15 верасня да 15 кастрычніка ў Мінскай вобласці.
- **У Беларусі за студзень — верасень выпусцілі сельскагаспадарчай прадукцыі на Br23,9 млрд.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Яўген БУЛОЙЧЫК, начальнік Галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінскага аблвыканкама:

— Я ўпэўнены, што перш чым хваліць чужое і захапляцца заморскімі прыгажосцямі, трэба навучыцца любіць і шанаваць сваё. У кожнай, нават самай маленькай вёсцы знойдзецца свая разыначка пачынаючы з яе слаўнай гісторыі. У кожным рэгіёне жылі і жывуць цудоўныя людзі, майстры сваёй справы: маскакі, рамеснікі, сапраўдныя гаспадары на зямлі. І ўсё можна дэманстраваць як наш здабытак, трэба толькі знайсці правільны ракурс.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ПАВІННЫ ШЧЫЛЬНЕЙ ПРАЦАВАЦЬ АДЗІН З АДНЫМ, КАБ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ВЫКЛІКАМ»

У Палацы Незалежнасці абмеркавалі беларуска-іранскае супрацоўніцтва

Акцэнт на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з першым віцэ-прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Махамадам Махберам быў зроблены на рэалізацыі дамоўленасцяў па выніках візіту беларускага лідара ў Іран у сакавіку гэтага года. Акрамя таго, бакі вызначылі далейшыя крокі па ўмацаванні двухбаковага супрацоўніцтва. Закраналася і міжнародная сітуацыя.

Прэзідэнт Беларусі выказаў спадзяванне, што першы віцэ-прэзідэнт Ірана не будзе расчараваны сваім візітам у нашу краіну. «Пытанняў шмат, ёсць аб чым пагаварыць. Спадзяюся, што наша размова будзе мець добры практычны вынік», — задаў тон сустрэчы беларускі лідар.

«Вы ведаеце сітуацыю, у якой знаходзіцца Беларусь, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Гэта прыкладна тая ж сітуацыя, у якой знаходзіцеся і вы. Ціск, які аказваецца на нашы дзяржавы, беспрэцэдэнтны, але вы ўжо навучыліся ў нейкай ступені гэтаму супрацьстаяць і ваш вопыт для нас вельмі важны».

Прэзідэнт адзначыў: яго пастаянна здзіўляе, што ў ходзе гэтых маштабных акцый за перыяд, калі Іран знаходзіцца пад санкцыямі, краіна ніколькі не знізіла свой узровень развіцця, а, наадварот, значна дадала. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што падчас яго візіту ў Іран два прэзідэнты дамовіліся аб выпрацоўцы плана дзеянняў на перспектыву, на многія гады наперад, каб тавараабарот, супрацоўніцтва ў цэлым развівалася больш паспяхова.

«Самае важнае і галоўнае, зыходзячы з вопыту адносін з Іранам, зыходзячы з многіх гадоў супрацоўніцтва з Іранам, я раблю высноў, што вашай і нашай бюракратыі трэба навучыцца вельмі аператыўна працаваць, і калі мы аб чымсьці дамовіліся, гэта павінна быць выканана ў тэрмін, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Самае галоўнае для нас — гэта не санкцыі і ціск, а час. І час гэты страціць у выніку бюракратычных перапонаў ні ў якім разе нельга. Тым больш што абстаноўка ў свеце абвастраецца. Блізкаўсходні крызіс садзейнічае таму, што несяброўскія нам краіны — Злучаныя Штаты Амерыкі і Захад — пастаянна накіроўваюць вастрыё гэтага канфлікту супраць Ірана. Вы гэта адчуваеце лепш. Наш адказ адзін: мы павінны шчыльней працаваць адзін з адным, разам супрацоўнічаць, каб супрацьстаяць гэтым выклікам».

Фота БелТА.

Вераніка КАНЮТА.

Палявыя работы

ЯК ПАКОРМІШ — ТАК І НАДОІШ

У канцы сезона аграрыі не збаўляюць тэмпаў

Працэс плюшчэння кукурузы і закладкі ў поліэтыленавыя рукавы на захоўванне.

Гэтымі восеньскімі днямі задача нумар адзін як для аграрыяў, так і мясцовых органаў улады — завяршыць палявыя работы ў аптымальныя тэрміны з захаваннем усіх тэхналагічных норм. У найбліжэйшы час Камітэт дзяржкантролю ва ўсіх рэгіёнах краіны пачне маштабныя праверкі якасці нарыхтоўкі травяных кармоў. Формулу — якасць азначае поспех у працы — на зубок вывучылі працаўнікі гаспадаркі Лоеўскага раёна Гомельшчыны — ААТ «Каўпень-Агра». Сельгаспрадпрыемства з году ў год паказвае вельмі добрыя вынікі па тэмпах вытворчасці малака, дабіваецца вяршынь у жывёлагадоўлі. За тым, як тут кіпіць працэс нарыхтоўкі кармоў, паназірала карэспандэнт «Звязды».

СТАР. 5

На слыху

ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА — ДЛЯ ЎСІХ

Што дае выпускніку статус маладога спецыяліста?

Каля 55 тысяч маладых рабочых і спецыялістаў з прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй былі размеркаваны сёлета ў арганізацыі і на прадпрыемствы нашай краіны. Паказчык размеркавання выпускнікоў устаноў адукацыі дасягае ў апошнія гады практычна 100 працэнтаў.

САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

«Маладым людзям, якія вучыліся за кошт сродкаў бюджэту на дзённай форме атрымання адукацыі, у нашай краіне гарантуецца атрыманне першага працоўнага месца ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, — падкрэслівае **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ.** — Сусветны вопыт сведчыць, што пачатак працоўнай дзейнасці спалучаны для моладзі са значнымі цяжкасцямі і рызыкамі, бо работадаўцы, як вядома, схільны аддаваць перавагу больш вопытным спецыялістам.

СТАР. 4

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Настасся ВАСІЛЕВІЧ на фестывалі «Педагагічны дэбют»: «Мы з маімі выхаванцамі, моцна ўзяўшыся за рукі, ідзём разам».

«Трэба падвергнуць рэвізіі напрамкі супрацоўніцтва Беларусі і Венесуэлы»

Сустрэча, накіраваная на ўмацаванне двухбаковых адносін Беларусі і Венесуэлы, адбылася ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з міністрам замежных спраў Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Іванам Эдуарда Хілем Пінта, які гэтымі днямі знаходзіцца з афіцыйным візітам у нашай краіне.

Вітаючы госця, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што міністр замежных спраў Венесуэлы вельмі своечасова прыехаў у Беларусь. «Я думаю, нам не трэба знаёміцца адзін з адным, не трэба казаць пра нашы магчымасці і магчымасці Венесуэлы ў нашым супрацоўніцтве. Мы ведаем адзін аднаго даўно і нямала зрабілі ў свой час для інтэнсіфікацыі нашага ўзаемадзеяння. З-за пэўных, знешніх перш за ўсё, прычын у нас была нейкая паўза ва ўзаемадзеянні. Адчуваю, што нам трэба падвергнуць рэвізіі ўсе тыя напрамкі і пытанні супрацоўніцтва, якія мы вызначалі яшчэ з часоў Уга Чавеса», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што неабходна вызначыцца, што Беларусь павінна і можа зрабіць для Венесуэлы. І ў той жа час варта акрэсліць, што Венесуэла можа зрабіць для нашай краіны. «Выпрацаваць адпаведны план, дарожную карту на найбліжэйшую, сярэднетэрміновую, а можа быць, і доўгатэрміновую перспектыву. Калі ў гэтую схему супрацоўніцтва давядзецца ўключыць іншыя дзяржавы, дапусцім Кубу, мы згодны. Словам, калі вы згодны, то да новага года міністр замежных спраў будзе гатовы рэалізаваць гэтыя дамоўленасці», — падсумаваў беларускі лідар.

У сваю чаргу Іван Эдуарда Хіль Пінта падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за гасцінны прыём. Ён падкрэсліў, што адносіны паміж Беларуссю і Венесуэлай дастаткова трывалыя і прайшлі 20-гадовы шлях умацавання. Ён расказаў, што падчас сустрэчы са сваім беларускім калегам Сяргеем Алейнікам яны абмеркавалі ўвесь спектр адносін і намецілі планы на найбліжэйшую перспектыву.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

У размове з журналістамі візіт у Беларусь, напоўнены сустрэчамі з палітычным кіраўніцтвам краіны, Іван Эдуарда Хіль Пінта назваў плённым. «Мы дамовіліся ажыццявіць перазапуск нашых адносін у гандлёва-эканамічнай, прамысловай сферах, і гэта мы маем намер зрабіць у найбліжэйшай будучыні. У якасці першага кроку — правядзенне ў Мінску чарговага пасяджэння сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве 28—29 лістапада. У пасяджэнні гэтай камісіі прымуць удзел прадстаўнікі міністэрстваў, кіраўнікі прадпрыемстваў абедзвюх краін. У рамках гэтага мерапрыемства мы канкрэтна прагаворым тыя напрамкі, якія маем і па якіх будзем рухацца далей», — сказаў міністр. Таксама плануецца развіваць супрацоўніцтва па іншых напрамках: энергетыка, сельская гаспадарка, турызм і інш. «Мы прыкладзём максімум намаганняў для таго, каб не проста перазапусціць нашы двухбаковыя адносіны, а вывесці іх на якасна новы ўзровень. Нас чакае шчыльная работа, нас чакае вялікі аб'ём работы», — заявіў Іван Эдуарда Хіль Пінта.

Адказваючы на пытанне журналістаў, ці перашкаджаюць заходнія санкцыі развіваць супрацоўніцтва Беларусі і Венесуэлы, Іван Эдуарда Хіль Пінта адзначыў, што санкцыі супраць нашых краін нелегітымныя і маюць злачынны характар. «Вядома ж, гэтыя санкцыі аказалі негатыўны ўплыў на нашы адносіны, з аднаго боку. З другога — санкцыі ўмацавалі нас у меркаванні, што мы павінны шчыльна разам працаваць, і гэтыя санкцыі яшчэ раз указалі нам на тое, што толькі сумеснымі намаганнямі мы можам забяспечыць свой рух наперад», — рэзюмаваў міністр.

Адлегласць супрацоўніцтву не перашкода

У Беларусі і Венесуэлы вялікі патэнцыял для далейшага супрацоўніцтва, заявіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава на сустрэчы з міністрам замежных спраў Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Іванам Хілем Пінта.

«Нягледзячы на адлегласці, для нас Венесуэла заўсёды была дружалюбнай краінай, а народ Венесуэлы — гэта добрыя сябры Беларусі, — сказала Наталля Качанава. — У нас набыты выдатны вопыт супрацоўніцтва літаральна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці: эканоміка, гуманітарная сфера, вядома, міжпарламенцкае ўзаемадзеянне. І ў аснове гэтых добрых дружалюбных адносін — безумоўна, адносіны паміж нашымі лідарамі — прэзідэнтамі Аляксандрам Лукашэнкам і Нікаласам Мадура».

Паводле слоў спікера, эканамічныя змяненні, якія адбыліся ў Венесуэле, заслугоўваюць усялякай павагі. «Вядома, мы разумеем, што наша супрацоўніцтва ў эканоміцы, гандлёва-эканамічнай сферы з'яўляецца асноўным, паколькі ў нас былі вельмі добрыя праекты напрацаваны раней — будаўніцтва жылля, сумесныя вытворчасці і прадпрыемствы», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Таксама Наталля Качанава выказала ўпэўненасць, што парламенцкія адносіны Беларусі і Венесуэлы выйдуць на абсалютна новы ўзровень. «Для нас як палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва вельмі важна супрацоўніцтва ў міжпарламенцкім вымярэнні. І, вядома, мы вельмі рады таму, што сёння нашы парламенцкія адносіны ў сувязі з вашым візітам выйдуць абсалютна на новы ўзровень узаемадзеяння, — сказала Наталля Качанава. — Маё перакананне, што ў гэты час глыбокай турбулентнасці ў свеце, калі ўсё вельмі хістка і нестабільна, такія краіны, як Венесуэла і Беларусь, паказваюць прыклад таго, як сёння краіны могуць жыць па сваіх законах, сваіх традыцыях і развівацца на карысць свайго народа. І тым важнейшая роля парламентарыяў у супрацоўніцтве на міжнародных пляцоўках, у міжнародных арганізацыях».

Спікер падзякавала Венесуэле за падтрымку нашай краіны на ўсіх міжнародных пляцоўках. «Таму што вы ведаеце, што для нас гэтыя гады няпростыя ў гісторыі. Няпростыя, выходзячы з той знешняй сітуацыі, якая складваецца вакол Беларусі», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

«Што датычыцца ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў нашай краіне, яна стабільная. Беларусь не проста жыве, а развіваецца, прымаючы асноўныя законы, якія патрэбны сёння для нашай краіны, для нашага народа. У 2022 годзе мы ўнеслі змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон — Канстытуцыю. І сёння практычна прывялі ўжо ў адпаведнасць усе законы, якія дзейнічаюць у нашай краіне, — расказала Наталля Качанава. — У нас стабільная эканоміка, працуюць прадпрыемствы. Дзяржава выконвае ўсе ўзятыя на сябе сацыяльныя праграмы. Для нас гэта вельмі важна».

Санкцыйны націск, умяшанне ва ўнутраныя справы нашай краіны, спробы Захаду дэстабілізаваць абстаноўку не ўдаліся, канстатавала спікер. «Вы цудоўна разумееце, як не проста ў такіх сітуацыях складваецца развіццё краіны. Але вельмі важна, што ёсць добрыя адносіны паміж краінамі, якія сапраўды дружалюбныя адна адной, якія ў аснову ставяць жыццё свайго народа, — дапоўніла Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы ніколі нікому не пагражалі і ніколі ад нашай краіны не будзе зыходзіць агрэсія ў адносінах да іншай краіны, таму што мы цудоўна разумеем, што такое мір і спакой на сваёй зямлі».

«І, вядома, ад парламентарыяў многае залежыць у гэтым пытанні. Мы павінны даносіць праўду да нашых калег, хто хацеў бы гэта чуць або не хацеў. Але мы абавязаны гэта рабіць — даносіць праўду аб міралюбнай палітыцы нашай краіны. Вось чаму мы асаблівую ўвагу ўдзяляем супрацоўніцтву паміж парламентарыямі нашых краін», — адзначыла Наталля Качанава.

Міжнародны вектар

НА КАРЫСЦЬ КРАІН І НАРОДАЎ

Міжпарламенцкія сувязі паміж Беларуссю і Іранам пашыраюцца

У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча Наталлі КАЧАНАВАЙ і Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ з першым віцэ-прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Махамадам МАХБЕРАМ.

«Трэба рухацца наперад»

Як звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў, у Беларусі добра ведаюць пра тыя добрыя, цёплыя пачуцці, якія ў Іране адчуваюць у адносінах да нашай краіны. «Беларускія парламентарыі выступаюць заўсёды за тое, каб сувязі сяброўства, супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ўмацоўваліся на карысць нашых народаў», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер ніжняй палаты парламента назваў сімвалічным тое, што візіт іранскай дэлегацыі праходзіць у год 30-годдзя з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Ісламскай Рэспублікай Іран. Ен нагадаў, што сёлета адбыўся візіт Аляксандра Лукашэнкі ў гэтую краіну, які вызначыў далейшую стратэгію двухбаковага ўзаемадзеяння.

Кажучы аб супрацоўніцтве ў эканоміцы, Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што мы заўсёды прытрымліваемся прынцыпу ўзаемнай выгады і сумеснага выйгрышу. «І вы ведаеце, што летась, нягледзячы на санкцыі, наш узаемны тавараабарот склаў больш за 100 мільёнаў долараў, — удакладніў спікер. — Цяпер, вядома, нам трэба рухацца наперад».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў упэўненасць у тым, што, нягледзячы на кароткі візіт, іранская дэлегацыя зможа ацаніць патэнцыял нашай краіны ў галіне прамысловасці, культуры, чалавечы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. Па яго словах, сустрэчы і перагаворы, якія праводзяцца, адкрыюць новыя кірункі ў супрацоўніцтве.

«Развіваць далейшае супрацоўніцтва па ўсіх кірунках»

Старшыня Савета Рэспублікі канстатавала, што Беларусь і Іран звязваюць добрыя сяброўскія адносіны на працягу многіх гадоў. «Мы заўсёды рады, калі да нас прыязджаюць нашы сябры і калегі — тыя людзі, з якімі нас звязваюць добрыя сяброўскія адносіны, — дадала Наталля Качанава. — Мы разумеем, што цяпер час вельмі няпросты. Ідзе геапалітычны падзел свету, і кожная краіна гэта адчувае на сабе. Прэзідэнт наш шмат разоў казаў аб тым, што час будзе вельмі няпросты, але тым важнейшыя для нас добрыя сяброўскія адносіны з тымі краінамі, якія прытрымліваюцца міралюбівай палітыкі, а самае галоўнае — развіваюцца па сваіх законах і традыцыях».

Спікер верхняй палаты парламента выказала словы ўдзячнасці іранскай дэлегацыі за падтрымку на міжнародных пляцоўках. «Для нас гэта вельмі важна, — падкрэсліла яна. — Вы ведаеце, што да нашай краіны прымяняюцца зусім неапраўданыя санкцыі. І той ціск, які здзяйсняецца сёння на Беларусь, не можа нас не турбаваць. Але, нягледзячы ні на якія санкцыі, наша краіна развіваецца, прытрымліваецца той палітыкі, якая была вызначана, — сацыяльна арыентаваная дзяржава. І Прэзідэнт дакладна паставіў задачы: санкцыі не павінны паўплываць на наш народ. Таму мы так цэнім сяброўства і супрацоўніцтва з краінамі, якія ўваходзяць сёння ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцва, БРІКС і дзякуем вам за падтрымку».

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на важнасці міжнароднага супрацоўніцтва паміж краінамі. «Мы выступаем з заявамі аб супрацьпраўных дзеяннях у адносінах да нашай краіны, — канкрэтызавала спікер. — Наша краіна сёння гатова супрацоўнічаць з усімі краінамі ў свеце, якія будуць дзейнічаць на канструктыў, стваральную працу. І, вядома, пра гэта, думаю, ішла размова ў Прэзідэнта нашай краіны, наша палітыка — міралюбівая. Мы ніколі нікому не ствараліняякіх пагроз і не праяўлялі ніякай агрэсіі. Таму нам незразумелая тая сітуацыя, якая нагнятаецца вакол нашай краіны з боку заходніх суседзяў і Амерыкі».

Кажучы аб узаемадзеянні ў эканоміцы і гуманітарнай сферы, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што гэта падмурак супрацоўніцтва паміж любымі краінамі. «Але для нас, парламентарыяў, вельмі важна, вядома, міжпарламенцкае ўзаемадзеянне, — удакладніла Наталля Качанава. — Таму мы з вялікай радасцю вітаем супрацоўніцтва паміж нашымі парламентарыямі і разлічваем на тое, што яно прынясе новы вынік для нашых краін і нашых народаў. Са свайго боку хацела б запэўніць, што мы гатовы да супрацоўніцтва, развіваць яго далей па ўсіх кірунках жыццядзейнасці нашых краін». Па меркаванні спікера, візіт іранскай дэлегацыі надасць новы імпульс адносінам паміж Беларуссю і Іранам.

У сваю чаргу, першы віцэ-прэзідэнт Ісламскай Рэспублікі Іран Махамад Махбер заўважыў, што Беларусь і Іран з'яўляюцца дзвюма краінамі, якія падвергнутыя незаконным, прыгнятальным санкцыям з боку Амерыкі. «Але Ісламская Рэспубліка Іран змагла выкарыстаць санкцыі, бо гэта тая падзея, якую неабходна ператварыць у магчымасць, — сказаў ён. — Санкцыі не абмяжоўваюцца толькі гэтым. Мы дасягнулі самых высокіх вынікаў і найлепшага поспеху падчас санкцый. Мы ў вельмі многіх сферах жыццезабеспячэння краіны былі залежныя. Падчас вайны з Іракам у нас нават не было калючага дроту, і мы не маглі яго паставіць. Цяпер самае развітае абсталяванне ў ваеннай сферы ствараецца ў Іране. Мы маем вельмі добрыя вынікі ў тэхналагічнай і навуковай сферах».

Вераніка КАНЮТА.

❍ У тэму

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАЧКОВА,** беларуска-іранскія адносіны будуюцца на аснове сяброўства, узаемапаразумення і павагі адзін да аднаго. «Найважнейшае значэнне ў развіцці двухбаковых адносін маюць пастаянныя палітычныя кантакты і дыялог паміж Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнтам Ірана, — удакладніў сенатар. — Гісторыя нашых адносін вельмі даўняя, мы заўсёды іх сур'ёзна развівалі. Сведчаннем таму з'яўляецца дзяржаўны візіт Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ў Іран, у ходзе якога была падпісана значная колькасць дакументаў, якія цяпер і вызначаюць стратэгію і тактыку развіцця беларуска-іранскіх адносін. Распрацавана дарожная карта, яна дэталёвая. У рэалізацыі гэтай карты таксама адводзіцца месца і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь. У нас вельмі добрае міжпарламенцкае супрацоўніцтва. Нядаўна была створана група сяброўства ў парламенце Ірана. У нас гэтая група сяброўства існуе з пачатку дзейнасці сёмага склікання Нацыянальнага сходу. Мы ўжо правялі шэраг узаемных візітаў у Іран і Рэспубліку Беларусь, абмяркоўваем вельмі канкрэтныя пытанні: пачынаючы ад тэм падтрымкі развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі і заканчваючы ўзаемадзеяннем на міжнародных пляцоўках».

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ,** узаемадзеянне з Іранам набывае не проста стратэгічнае, а і геапалітычнае значэнне. «Сенння такія дзяржавы, як Беларусь, Расія, Кітай і Іран, становяцца апорамі бяспекі, устойлівага, а галоўнае, прагназуемага развіцця на мацерыку Еўразія, — канкрэтызаваў дэпутат. — Мы абавязаны захаваць мір, стабільнасць у працэсе трансфармацыі свету на шматпалярны. Мы бачым, што колькасць лакальных канфліктаў павялічваецца. Бачым рост нестабільнасці, напружанасці, прамое ўзброенае супрацьстаянне ў розных рэгіёнах планеты, таму нам трэба забяспечыць узаемадзеянне, якое акурат будзе накіравана на стабілізацыю сітуацыі, забеспячэнне прагназуемай будучыні».

КАСТРЫЧНІК — МЕСЯЦ СЯМЕЙНЫХ СВЯТ

Учора ў Доме прэсы ў рамках Тыдня бацькоўскай любові прайшоў круглы стол «Моцная сям'я — моцная дзяржава». Падчас яго абмеркавалі актуальныя новаўвядзенні ў дзяржаўнай падтрымцы шматдзетных сем'яў; грамадскія ініцыятывы, якія папулярызуюць сямейныя традыцыі і каштоўнасці, а таксама паразважалі пра тое, як павысіць прэстыж мацярынства і бацькоўства. Пасля размовы па добрай традыцыі ўручылі дыпломы пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава».

Паводле слоў выступоўцаў, у нашай краіне падтрымка сям'і была і будзе нацыянальным прыярытэтам. «Тэма сям'і з'яўляецца адной з прыярытэтных і ў беларускіх СМІ, — падкрэсліў **першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Для нас стала добрай традыцыяй штогод сумесна з Беларускім саюзам жанчын праводзіць Рэспубліканскі творчы конкурс сярод журналістаў «Моцная сям'я — моцная дзяржава». Задача, пастаўленая перад СМІ, — не толькі інфармаваць, але і актыўна фарміраваць грамадскае меркаванне, садзейнічаць стварэнню станоўчага іміджу сям'і. Бо каштоўнасныя арыенціры, закладзеныя праз медыя, у многім вызначаюць сучасныя мадэлі сямейных паводзін». Што датычыцца конкурсу, то сёлета ён праводзіўся 13-ы раз. Усяго члены журы ацэньвалі 96 работ з 88 рэдакцый рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі. «Лідарамі па колькасці матэрыялаў, пададзеных на конкурс, сталі Мінская і Магілёўская вобласці, — адзначыў Андрэй Кунцэвіч. — Мы ўдзячныя ўсім рэдакцыям і асобным аўтарам, якія прадстаўляюць гэту тэматыку ў сваіх сродках масавай інфармацыі. Сапраўды, сям'я — самае важнае ў жыцці кожнага. Будуць моцныя сям'і — будзе моцная наша дзяржава». Ён таксама падкрэсліў, што сям'я і дзяржаўнасць заўсёды былі і будуць асноўнымі традыцыйнымі беларускімі каштоўнасцямі.

Старшыня Мінскай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА падкрэсліла, што вельмі важна звяртаць асаблівую ўвагу на маладыя сем'і. «У гэтым годзе я правяла дзве вялікія сустрэчы з маладымі сем'ямі, і ўсе яны кажуць, што маюць патрэбу ў мудрасці, досведзе старэйшага пакалення. Таму і ў далейшым на такія сустрэчы будзем запрашаць сем'і, якія пражылі ў шлюбе па 50 і больш гадоў, каб яны дзяліліся парадамі, сваімі сямейнымі каштоўнасцямі. Трэба, каб такіх мерапрыемстваў было як мага болей і не толькі падчас бацькоўскага тыдня, але і на працягу года. Сям'я — гэта бясцэнны дар, які не ўсім даецца, таму вельмі важна яго захаваць і прымножыць. Бо, думаю, усе пагодзяцца, што шчасце — яно ў тым ліку і ў дзецях».

Пра падтрымку шматдзетных сем'яў распавяла **намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Святлана КОВАЛЬ:** «Бацькоўства — вялікая праца. Ад мамы і таты ў роўнай ступені залежыць не толькі дабрабыт сям'і і дзяцей, але і ўсёй краіны і тое, якой яна будзе праз дзесяцігоддзі. Менавіта таму наша краіна актыўна выступае ў абарону сям'і і сямейных каштоўнасцяў, а падтрымцы бацькоў дзяржавай удзяляецца вялікая ўвага. У прыватнасці, забяспечваецца матэрыяльная падтрымка сям'і пры нараджэнні і выхаванні дзяцей, ажыццяўляецца дапамога ў вырашэнні жыллёвых пытанняў шматдзетным і маладым сем'ям з двума дзецьмі, развіваецца інфраструктура дзіцячых адукацыйных і медустаноў, пашыраюцца магчымасці для культурнага сямейнага адпачынку. Сістэма сацыяльнай падтрымкі, якая выбудавана ў інтарэсах сям'і з дзецьмі, — нацыянальны здабытак нашай краіны. І яна з гадамі прымнажаецца».

У ліку навацый апошніх гадоў — развіццё праграм сямейнага капіталу. Так, прадстаўлена права на датэрміновае выкарыстанне сродкаў сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў шматдзетным сем'ям. Тыя, хто вырашыў сваё жыллёвае пытанне, могуць накіраваць гэтыя сродкі на аплату адукацыі як дзецям, так і бацькам, альбо на медпаслугі, у прыватнасці стаматалагічныя. З 2022 года для дадатковай падтрымкі шматдзетных сем'яў, у якіх мама або тата ці дзіця мае інваліднасць, уведзены яшчэ адзін кірунак датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу на набыццё сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі.

Былі расшыраныя працоўныя гарантыі для бацькоў, уведзены дыстанцыйная занятасць, водпуск па доглядзе за дзіцем для таты, дадзена права выбару водпуску ў летні час татам, калі ў сям'і выхоўваецца дзіця з інваліднасцю, права выкарыстання працоўнага адпачынку да заканчэння 6 месяцаў

Фота Белтă.

работы ў наймальніка для татаў з двума дзецьмі да 17 гадоў.

Сёлета прыняты навацыі і змяненні ў Працоўны кодэкс, якія таксама пашыраюць гарантыі бацькоў з трыма і больш дзецьмі альбо якія выхоўваюць дзіця з інваліднасцю. З 1 студзеня 2024 года ў іх з'явіцца магчымасць выбару, як выкарыстаць дадаткова свабодны ад работы час. Замест свабоднага дня ў тыдзень работнік — тата ці мама — зможа выбраць скарачэнне работы ці змены на адну гадзіну (так званае штодзённае скарачэнне). Зручнымі будуць новыя падыходы, у адпаведнасці з якімі дыстанцыйная работа можа мець не толькі пастаянны характар, але і часовы — да 6 месяцаў у каляндарным годзе, а таксама ажыццяўляцца шляхам чаргавання дыстанцыйнай работы і на працоўным месцы ў арганізацыі — камбінаваная работа.

Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяна КРАЎЧАНКА, маці пяцярых дзяцей, згадала, што ў 1990-х, калі толькі засноўвалі грамадскае аб'яднанне, у шматдзетных сем'яў была праблема з атрыманнем жылля. «Сёння, на шчасце, такой праблемы няма. Практычна кожная шматдзетная сям'я мае магчымасць атрымаць жыллё на працягу 2 гадоў, прадугледжаны льготы па пагашэнні крэдыту (сям'я з чатырох і больш дзецьмі мае магчымасць 100-працэнтнага пагашэння льготнага крэдыту; сям'я, у якой выхоўваецца трое дзетак, — 75 %). Гэта мае вялікае значэнне для шматдзетных сем'яў. Я хачу звярнуцца да ўсіх маладых жанчын: не бойцеся нараджаць да 30 гадоў, каб паспець стаць мамай як мінімум трох! Бо мець шмат дзетак — вялізнае шчасце. З узростам гэта разумееш больш яскрава. Дзеці не замінаюць кар'еры, хутчэй, наадварот, дапамагаюць. З 28 шматдзетных жанчын, якім 13 кастрычніка ўручылі ордэны Маці, толькі чатыры хатнія гаспадыні, астатнія працуюць, многія займаюць высокія пасады».

Гэтую думку пра кар'еру пацвердзіла і **шматдзетная мама, удзельніца рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года», старшыня пярвічнай арганізацыі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь ГА «Беларускі саюз жанчын» Юлія ТРЫКОЗА:** «Я заўсёды кажу на розных мерапрыемствах, на якія мяне запрашаюць: «Дзяўчаты, нараджайце да 25 гадоў. Кар'ера ад вас нікуды не ўцячэ. Яе зрабіць вы яшчэ паспееце, а дзяцей, калі адкладаць іх нараджэнне бліжэй да сарака, можаце і не паспець нарадзіць. Вялікая сям'я — гэта здорава, хоць разам з тым і адказна. Але калі дзеці падрастаюць, вельмі прыемна, калі цябе дома сустракаюць смачнай вячэрай і цёплымі абдымкамі».

Усе выступоўцы адзначалі, што за апошнія гады вельмі ўзрасла роля татаў у выхаванні дзяцей. Так, паводле слоў **загадчыцы лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», прафесара, доктара медыцынскіх навук Маргарыты ДЗЕВЯЛТОЎСКАЙ,** праводзілася апытанне, па выніках якога 80 працэнтаў мужчын лічаць, што ў выхаванні дзяцей павінны ўдзельнічаць як жанчыны, так і мужчыны.

Старшыня праўлення рэспубліканскага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Клуб львоў» Вячаслаў ШЧЭРБА адзначыў, што татаў сёння можна ўбачыць паўсюль: «Яны здзяйсняюць пакупкі для сваіх дзяцей, водзяць грудзічкоў у паліклінікі. У нас шмат праектаў па прывіцці татам адказнага свядомага бацькоўства, прыцягнення іх да клопату і выхавання сваіх дзяцей. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца «Тата-школы». Дзякуючы падтрымцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны нам удалося дасягнуць дамоўленасць з установамі сацабароны, і сёння пры кожнай з іх па запатрабаванні можа быць праведзена «Тата-школа». З татамі трэба размаўляць, данесці ім, што іх роля ў сацыялізацыі дзяцей, асабліва хлопчыкаў, вельмі вялікая. У жыцці дзяўчынкі тата таксама адыгрывае істотную ролю, бо не сакрэт, што тыя вельмі часта выбіраюць будучага мужа, які падобны да бацькі. Карыстаюцца папулярнасцю і нашы летнікі для татаў і іх дзяцей — падлеткаў. Туды складана трапіць, бо ёсць абмежаванне па колькасці. У такіх летніках прымаюць удзел розныя таты: з поўных сем'яў, таты выхаднога дня, удаўцы, якія адны выхоўваюць дзяцей. Падчас гэтых летнікаў мы бачым, што нашы таты вельмі адказныя і надзейныя. Мы раней штогод праводзілі свята «Татаў дзень — кожны дзень». І вельмі ўсцешыліся, што ў нашай краіне з'явіўся Дзень таты на дзяржаўным узроўні».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіраўнік Пентагона аддаў ваенным загад быць гатовымі да разгортвання на Блізкім Усходзе



Кіраўнік Мінабароны ЗША Лойд Осцін ужо аддаў ваенным загад быць гатовымі да разгортвання на Блізкім Усходзе. Пра гэта тэлеканалу Fox News заявіў высокапастаўлены амерыканскі чыноўнік, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, якія менавіта падраздзяленні ВС ЗША будуць прыцягнуты і пры якіх абставінах будуць задзейнічаны, пакуль невядома. Па словах чыноўніка, вайскоўцы будуць размешчаны не для ўдзелу ў баявых дзеяннях. Раней выданне The Wall Street Journal інфармавала, што Мінабароны ЗША адабрала каля дзвюх тысяч ваенных для падрыхтоўкі да патэнцыяльнага разгортвання на Блізкім Усходзе. На дадзены момант адабраныя вайскоўцы знаходзяцца на Блізкім Усходзе і ў Еўропе. У сваю чаргу ў эфіры тэлеканала CNN са спасылкай на крыніцу ў Пентагоне было заяўлена, што Вашынгтон накіроўвае да берагоў Ізраіля каманду хуткага рэагавання з дзвюх тысяч марскіх пехацінцаў. Намеснік прэс-сакратара Пентагона Сабрына Сінгх у сваю чаргу паведаміла, што кіраўнік Мінабароны ЗША Лойд Осцін у тэлефоннай размове з ізраільскім калегам Ёавам Галантам заявіў, што Вашынгтон мае намер аказваць ваенную дапамогу Ізраілю ў паскораным парадку.

Партыя «Права і справядлівасць» страціла большасць у польскім парламенце



Пасля апрацоўкі ўсіх бюлетэняў кіруючая партыя «Права і справядлівасць» на чале з лідарам Ярославам Качыньскім атрымала на парламенцкіх выбарах у Польшчы найбольшую колькасць галасоў — 35,38 працэнта, паведаміла радыё RMF 24. Апазіцыйная «Грамадзянская кааліцыя» на чале з былым прэм'ерам Польшчы і экс-старшынёй Еўрасавета Дональдам Тускам набрала 30,7 працэнта. Блок «Трэці шлях» набраў 14,4 працэнта, «Левыя» — 8,61 працэнта і партыя «Канфедэрацыя» — 7,16 працэнта. Кіруючая партыя «Права і справядлівасць» страціла большасць у парламенце Польшчы, у апазіцыі ёсць шанц сфарміраваць кіруючую кааліцыю. Як вядома, галасаванне на парламенцкіх выбарах у Польшчы прайшло 15 кастрычніка. Жыхары рэспублікі павінны былі абраць 460 дэпутатаў Сейма і 100 сенатараў. Адзначаецца, што яўка на выбарах у Сейм, якая склала больш за 74 працэнты, стала самай высокай у гісторыі выбараў у Польшчы з 1989 года.

На аднаўленне Афганістана пасля землетрасення патрабуецца звыш 93 мільёнаў долараў

Паводле апошніх ацэнак, 1,5 тысячы чалавек загінулі і каля дзвюх тысяч атрымалі раненні ў выніку землетрасення, якое адбылося ў Афганістане 7 кастрычніка. Аб гэтым паведаміў выконваючы абавязкі гуманітарнага каардынатара ААН у краіне Данііэль Эндрэс. Ён таксама паведаміў, што землетрасенне разбурыла больш за 3,3 тысячы дамоў. Значны ўрон быў нанесены сістэмам водазабеспячэння і калодзежам, а вялікія аб'ёмы смецця ад разбураных пабудоў могуць прывесці да забруджвання вады і ўспышак захворванняў. Па словах Эндрэса, па начах ужо даволі холадна, але людзі, чые дамы былі пашкоджаныя, начуюць на вуліцах, у тым ліку ў горадзе Герат, апасаючыся, што пашкоджаныя дамы павалянца.

ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА — ДЛЯ ЎСІХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Знайсці работу і затрымацца на ёй учарашнім студэнтам без прафесійнага досведу даволі складана. Між іншым, правы выпускнікоў, якія працуюць па размеркаванні ў якасці маладых спецыялістаў, у нашай краіне абароненыя законам.

Для маладых спецыялістаў не прызначаецца выпрабавальны тэрмін. Пасля заканчэння навучання ім выплачваецца грашовая дапамога ў памеры стыпендыі, выдзяляецца адпачынак працягласцю 31 дзень, а для будучых педагагічных работнікаў — 45. Таксама абмежаваныя магчымасці наймальніка па звальненні маладога спецыяліста, пераводзе яго на іншую працу, не звязаную з атрыманай спецыяльнасцю. Наймальнік не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць займанай пасадзе ці выконваемай рабоце з прычыны недастатковай кваліфікацыі».

Ёсць розныя льготы пры пастаноўцы на чаргу для паляпшэння жыллёвых умоў. Маладыя спецыялісты могуць прэтэндаваць на атрыманне арэнднага жылля або на грашовую кампенсацыю за наём жылога памяшкання. Да абавязковых выплат адносіцца кампенсацыя ў сувязі з пераездам на работу ў іншую мясцовасць.

УВАХОДЖАННЕ Ў ПРАФЕСІЮ

Сяргей Пішчоў адзначыў, што студэнты і навучэнцы, якія атрымлівалі адукацыю на платнай аснове, у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам таксама могуць быць накіраваны на работу па іх жаданні. Штогод дадзенае права выкарыстоўваюць каля 2 тысяч выпускнікоў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

— Па нашых назіраннях цікавасць да накіравання на першае месца працы сярод выпускнікоў платнай формы навучання расце. У адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі такім выпускнікам таксама прысвойваецца статус маладога спецыяліста з усім наборам сацыяльных гарантый і прэферэнцый, — падкрэслівае начальнік упраўлення прафесійнай адукацыі. — З улікам важнасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для нашай эканомікі, а таксама каб забяспечыць гарантаванае першае працоўнае месца ўсім, у цяперашні час Міністэрства адукацыі прапрацоўвае нарматыўнае замацаванне ў падыходах па накіраванні на першае месца працы таксама і выпускнікоў платнай формы навучання. Такая практыка не з'яўляецца новай, на працягу шэрагу гадоў падобны вопыт маецца ў выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў, якія апроч асноўнага навучання праходзяць інтэрнатуру для таго, каб атрымаць пэўныя практычныя навыкі і дадатковыя прафесійныя кампетэнцыі для паспяховага далейшага працаўладкавання і засваення сваёй прафесіі.

На думку спецыяліста, размеркаванне і накіраванне на першае месца працы выпускнікоў устаноў адукацыі неабходна разглядаць як практыка-арыентаваны працяг іх навучання, але ўжо на працоўным месцы. Гэта дае магчымасць забяспечыць паспяховае ўваходжанне ў прафесію, набыць практычныя і прафесійныя кампетэнцыі і навыкі.

— Мяркуем, што **аптымальны тэрмін для вырашэння дадзенай задачы — не менш за два гады з выкарыстаннем інстытута настаўніцтва, гэта значыць, з прыцягненнем вопытных работнікаў.** З улікам сацыяльных гарантый, якія мае малады спецыяліст, Міністэрства адукацыі сумесна з зацікаўленымі праводзіць цяпер работу па забеспячэнні ўсіх выпускнікоў як бюджэтнай, так і платнай формы навучання першым працоўным месцам, — праінфармаваў начальнік упраўлення прафесійнай адукацыі. — Хачу падкрэсліць, што роўныя магчымасці павінны быць ва ўсіх выпускнікоў: як бюджэтнай, так і платнай формы навучання...

Сяргей Пішчоў дадаў, што важным прынцыпам змяненняў, якія ўносяцца, з'яўляецца шырокае інфармаванне ўсіх зацікаўленых і ўступленне іх у сілу толькі пасля прыняцця. Гэта значыць, што **прапанаваныя навацыі не закрануць тых, хто навучаецца па дзейным заканадаўстве.**

Нагадаем, што да апошняга часу абавязковаму размеркаванню падлягалі толькі выпускнікі ўстаноў прафесійнай адукацыі, якія скончылі курс навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў і былі накіраваны на работу камісіяй па персанальным размеркаванні. Калі навацыі будуць прыняты, то размяркоўваць у абавязковым, а не добраахвотным парадку будуць і моладзь, якая пажадае атрымліваць адукацыю за ўласныя сродкі.

ЗАТРЫМАЦЬ КАДРЫ Ў РЭГІЁНАХ

Забеспячэнне адукацыйнай галіны маладымі кадрамі стаіць сёння даволі востра на парадку дня. У розных рэгіёнах адчуваецца дэфіцыт настаўнікаў фізікі, матэматыкі, пачатковых класаў, выхавальнікаў дашкольных устаноў, сацыяльных педагогаў, педагогаў-псіхолагаў. І справа не ў тым, колькі маладых спецыялістаў штогод выпускаецца. Важна, колькі іх затрымліваецца ў сістэме адукацыі.

— У Галіновым пагадненні паміж прафсаюзам і Міністэрствам адукацыі прадугледжаны дадатковыя гарантыі для маладых спецыялістаў: меры матэрыяльнага стымулявання, надбаўкі за работу па кантракце, — паведаміла **загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай работы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Алена ВЯРБІЛА.** — Напрыклад, у Мінску для маладых педагогаў прадугледжана даплата ў памеры 20 працэнтаў ад аклада. Ва ўстановах адукацыі актыўна развіваецца інстытут настаўніцтва: за кожным маладым педагогам замацоўваецца дасведчаны спецыяліст. У многіх рэгіёнах маладым педагогам кампенсуюцца выдаткі за арэнду жылля. Так, на Брэстчыне на працягу шэрагу гадоў выпускнікам (маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым)) штомесяц кампенсуюцца выдаткі за наём жылых памяшканняў у памеры да трох базавых велічынь у Брэсце, Пінску і Баранавічах, а ў іншых населеных пунктах вобласці — да дзвюх базавых велічынь.

Фота БелТА.

Пасля заканчэння Полацкага каледжа ВДУ імя П. М. Машэрава двайняты Марыя і Дар'я ЧУМАКОВЫ па размеркаванні прыйшлі працаваць у дзіцячы садок № 1 гарадскога пасёлка Расоны. Марыя — музычны кіраўнік, Дар'я — выхавальнік дашкольнай адукацыі.

«На думку спецыяліста, размеркаванне і накіраванне на першае месца працы выпускнікоў устаноў адукацыі неабходна разглядаць як практыка-арыентаваны працяг іх навучання, але ўжо на працоўным месцы. Гэта дае магчымасць забяспечыць паспяховае ўваходжанне ў прафесію, набыць практычныя і прафесійныя кампетэнцыі і навыкі».

Натуральна, на месцах усе разумеюць, што без жылля замацаваць кадры, асабліва ў сельскай мясцовасці, немагчыма, таму шукаюць месцы ў інтэрнатах, даюць службовае жыллё, дапамагаюць будаваць сваё. Прафсаюзы хадайнічаюць аб выдзяленні для маладых спецыялістаў арэнднага жылля ці месцаў у інтэрнатах іншых ведамстваў.

На жаль, але абавязак забяспечваць маладога спецыяліста жыллём нідзе на заканадаўчым узроўні не прапісаны. Адзіная гарантыя ў гэтай сферы, замацаваная на дзяржаўным узроўні, — права маладога спецыяліста, які прыбыў па месцы размеркавання, прымацца на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без дадатковых патрабаванняў па неабходным тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце, у тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне.

Традыцыйнай для сталіцы стала жнівеньская сустрэча з маладымі педагогамі, якую арганізоўвае прафсаюз. Запрашаюць юрыстаў, эканамістаў, бухгалтараў, якія кансультуюць моладзь па ўсіх пытаннях. А пытанняў узнікае шмат. Напрыклад, усіх без выключэння цікавіць, ад якіх фактараў залежыць іх заработная плата? Ці можна паўплываць на яе памер? З якім стажам педагог можа прэтэндаваць на кваліфікацыйную катэгорыю? На якую матэрыяльную дапамогу могуць разлічваць іншагароднія педагогі, размеркаваныя ў сталіцу? Як правільна павінны быць аформлены працоўныя адносіны? Куды ўвогуле звяртацца з пытаннямі, якія датычацца прафесійнай дзейнасці? Хто можа дапамагчы па-за сценамі тваёй школы?

З УЛІКАМ СЯМЕЙНЫХ АБСТАВІН

— Штогод наш універсітэт праводзіць маніторынг замацавання сваіх выпускнікоў на працоўных месцах, якія ім прадстаўляюцца. Зыходзячы з практыкі, сярэдняя лічба за некалькі гадоў складае 70 працэнтаў, — паведаміў **начальнік аддзела кадраў БДПУ імя Максіма Танка Віталь КАЗАКОЎ.** — Але ў некаторых рэгіёнах, у прыватнасці ў Мінскай вобласці (Уздзенскім, Любанскім, Салігорскім, Старадарожскім, Клецкім, Чэрвеньскім раёнах), гэты паказчык дасягае 100 працэнтаў.

У 2023 годзе былі размеркаваны 687 выпускнікоў нашага ўніверсітэта, якія навучаліся за кошт бюджэтных сродкаў. Віталь Казакоў запэўнівае, што камісія па размеркаванні праводзіць вялікую працу, якая пачынаецца ў снежні — студзені. А ў лютым — сакавіку прадстаўнікі кадравай службы сустракаюцца з выпускнікамі, знаёмяць іх з заканадаўчай базай, адказваюць на пытанні, улічваюць пажаданні.

«У першую чаргу мы працуем на забеспячэнне кадрамі сталіцы і Мінскай вобласці. Але заўсёды ідзём насустрач нашым студэнтам, якія паспелі стварыць сям'ю. Сем'і мы не раздзяляем, — запэўніў Віталь Казакоў. — Увогуле, прыслухоўваемся да пажаданняў выпускнікоў. Прывяду адзін з нядаўніх прыкладаў: выпускнік з рэгіёна, які не адносіцца да асноўных заказчыкаў кадраў ВНУ, пажадаў размеркавацца ў школу, з якой добра знаёмы, таму што сам вучыўся ў ёй. Камісія па размеркаванні разгледзела гэтае пытанне і вынесла рашэнне на карысць выпускніка. Бывае і так, што студэнты просяць аб пераразмеркаванні на непедагагічныя спецыяльнасці. Такія звароты ёсць, і яны датычацца ў асноўным пераходу на кантрактную службу ў сілавыя структуры».

НАЙБОЛЬШ ВАЖНАЯ ГЛАВА

У верасні паралельна з фіналам рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» у краіне прайшоў фінал рэспубліканскага фестывалю «Педагагічны дэбют». Ён праводзіўся ўпершыню, але ў яго ёсць усе шанцы стаць традыцыйным. У цэнтры ўвагі фестывалю-конкурсу — маладыя настаўнікі, выхавальнікі дашкольных устаноў, маладыя дырэктары школ і маладыя загадчыкі ўстаноў дашкольнай адукацыі (узроставая планка — да 31 года і прафесійны стаж — да пяці гадоў). У Міністэрстве адукацыі лічаць важным падтрымаць не толькі вопытных педагогаў, але і тых, хто робіць у педагагічнай прафесіі толькі першыя крокі. Там разумеюць, што папаўненне сістэмы адукацыі маладымі спецыялістамі надае імпульс яе развіццю...

Выпускніца БДПУ, выхавальнік маладзечанскага дзіцячага садка № 27 Настасся ВАСІЛЕВІЧ стала ў сваёй намінацыі пераможцай.

— У жніўні 2021 года я па размеркаванні прыйшла працаваць у садок. І хоць ужо мела невялікі педагагічны вопыт, напэўна, як і ўсе маладыя спецыялісты, хвалявалася, ці змагу ўліцца ў новы калектыў, ці знайду агульную мову з дзецьмі, іх бацькамі і калегамі, ці змагу рэалізаваць свой творчы патэнцыял, — прызнаецца Настасся. — Але літаральна з першых рабочых дзён зразумела, што мяне акружаюць не проста спецыялісты і прафесіяналы ў сваёй справе, але і вельмі душэўныя людзі, якія прынялі мяне ў свой калектыў лёгка, адкрыта і шчыра. Прызнаюся, мне вельмі спатрэбіўся мой вопыт, атрыманы ў ходзе практыкі, а педагагічная практыка распачынаецца ў БДПУ з першага курса. Таксама прыемным бонусам для мяне сталі матэрыяльныя заахвочванні, прадугледжаныя для маладых спецыялістаў. І сёння, прайшоўшы ўвесь шлях — ад першага дня вучобы да перамогі ў рэспубліканскім фестывалі, — хачу выказаць удзячнасць сваёй альма-матар за тыя веды і ўменні, якія я там набыла. З упэўненасцю магу сказаць: цяперашні калектыў — мае апора і сям'я. Калегі — вельмі важныя для мяне людзі. Самае галоўнае для мяне як для маладога спецыяліста, які яшчэ толькі пачынае свой шлях, — гэта ўпэўненасць, што побач са мной — сапраўдная каманда! Мы з маімі выхаванцамі, моцна ўзяўшыся за рукі, ідзём разам. Я разам з імі мару, шукаю сябе, імкнуся ахапіць неабдымнае, узлятаю, не баючыся ўпасці, спадзяюся, веру і люблю. Разам нам пад сілу любы экзамен жыцця. Я толькі пачынаю пісаць яго старонкі і веру, што найбольш важнай главой стане педагогіка...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Энергетыка

АТАМНЫЯ, ЛІЧБАВЫЯ, ЭФЕКТЫЎНЫЯ ЗДАБЫТКІ І КІРУНКІ ENERGY EXPO

ESG-трансфармацыя, устойлівае развіццё, інвестыцыйная дзейнасць, лічбавізацыя, электрыфікацыя жылля, выкарыстанне атамнай энергіі ў няядзерных сферах, інавацыйныя праекты і свежыя рашэнні ў сферы электраэнергетыкі і рэсурсазберагальных тэхналогій і экалогіі. Гэтыя і іншыя пытанні і дасягненні абмяркоўваюць і паказваюць на XXVII Беларускім энергетычным і экалагічным форуме Energy Expo, які праходзіць у Мінску, экспаненты больш як 200 айчынных і замежных прадпрыемстваў і арганізацый.

На выставе ў рамках форуму нямала цікавых актыўнасцяў. На гэтым фота начальнік аддзела ААТ «БелГАЗБУД» — кіруючая кампанія холдынга» Анатоль ПЛЫСАК дэманструе маладому наведвальніку магчымасці трэнажора «Экскаватар-студэнт», прызначанага для навучання па прафесіі машыніст экскаватара.

Атамная электрыфікацыя

За час свайго існавання форум стаў найбуйнейшай дзелавой і выставачнай пляцоўкай для паліўна-энергетычнага комплексу, які садзейнічае развіццю галіны, і найважнейшае месца ў парадку дня форуму займае атамная энергетыка, заўважыў **Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі,** падчас афіцыйнага адкрыцця мерапрыемства:

— Функцыянаванне БелАЭС ужо робіць важкі ўнёсак ва ўмацаванне энергетычнай самастойнасці Беларусі. Разам з асваеннем мірнага атама сёння перад намі стаіць задача максімальна выкарыстоўваць патэнцыял сумежных галін: прамысловасці і адытыўных тэхналогій, электратранспарту і сістэм накаплення, лічбавізацыі і іншых.

Другі рэактар БелАЭС цяпер працуе на намінальнай магутнасці, у рамках яго доследна-прамысловай эксплуатацыі праведзена больш за 440 выпрабаванняў, якія павінны былі пацвердзіць работу тэхналагічных сістэм. Афармляюцца неабходныя дакументы для сёлетняй здачы другога энергаблока ў эксплуатацыю. Сумарна два энергаблокі выпрацавалі ўжо больш за 20 млрд кВт·г энергіі, што дазволіла замясціць 5,3 млрд м³ газу, удакладніў міністр.

Другі энергаблок увойдзе ў эксплуатацыю напрыканцы года. На першым цяпер адбываецца другі планава-папераджальны рамонт, падчас якога будзе заменена 25 % адпрацаванага паліва, удакладніў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі.**

Ён нагадаў, што, згодна з комплексным планам развіцця электраэнергетычнай галіны з улікам уводу БелАЭС, спажыванне электраэнергіі ў краіне будзе павялічвацца. За найбліжэйшае пяцігоддзе (да канца 2025-га) у Беларусі плануюць збудаваць 2 млн м² новага шматкватэрнага жылля, дзе ацяпленне і абагрэў будзе забяспечваць электраэнергія.

— Шматкватэрныя дамы, дзе сёння печкі, таксама плануюць перавесці на электраацяпленне і гарачае водазабеспячэнне. Аблвыканкамы ўжо вызначылі больш за сотню такіх дамоў у краіне. Мы падвядзём да абазначаных дамоў патрэбную інжынерную інфраструктуру, а ўнутраная рэканструкцыя мае адбывацца за грошы з удзелам бюджэту вобласці. Працягваецца і электрыфікацыя індывідуальнага жылля для ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў сельскай мясцовасці. Мы маем больш за 100 тысяч такіх зваротаў ад жыхароў (звыш 80 % з іх задаволена), — паведаміў намеснік міністра.

У саюзных рамках

Закрануў Віктар Каранкевіч і пытанне фарміравання аб'яднаных рынкаў газу і электраэнергіі, паведаміўшы, што на завяршальнай стадыі знаходзіцца адзін з найважнейшых дакументаў — праект дагавора па фарміраванні аб'яднанага рынку электраэнергіі Саюзнай дзяржавы. На гэткім жа этапе і падрыхтоўка правіл арганізацыі работы аб'яднанага рынку.

Ён удакладніў, што Беларусь гатова забяспечыць пастаўку электраэнергіі і на экспарт, а не толькі для ўнутраных патрэб. Што датычыцца экспарту энерганосьбіту ў Расію, то гэта якраз прадмет размовы ў рамках фарміравання аб'яднанага рынку электраэнергіі. Усе пытанні адносна паставак, спажывання і набыцця электраэнергіі на агульным рынку будуць вызначаны ў правілах.

— Працягваецца работа па фарміраванні аб'яднанага рынку газу. Для Беларусі вызначаны асноўныя цэнавыя ўмовы паставак газа на 2023—2025 гады. У гэты ж час будуць узгадняцца прынцыпы работы аб'яднанага рынку з мэтай далейшага збліжэння ўмоў гаспадарання суб'ектаў Беларусі і Расіі, — падзяліўся міністр.

У рамках форуму быў падпісаны шэраг пагадненняў паміж арганізацыямі Дзяржкарпарацыі «Расатам» і беларускімі ведамствамі. Доўгатэрміновае пагадненне аб супрацоўніцтве падпісана паміж прадпрыемствам «Беларуская арганізацыя па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі» і расійской кампаніяй «ЦВЭЛ». Дакументам плануецца супрацоўніцтва ў галіне стварэння і развіцця інфраструктуры для фінальнай ізаляцыі радыеактыўных адходаў у Беларусі і падрыхтоўкі персаналу для эксплуатацыі прыпаверхневага пункта захоўвання адходаў, адзначылі падпісанты.

Пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы рэалізацыі сумесных праектаў на аснове праграмных прадуктаў і лічбавых рашэнняў падпісалі краінавы офіс Дзяржкарпарацыі «Расатам» у Беларусі — кампанія «РусатамБел», арганізацыя «Міжнародны дзелавы альянс» і аб'яднанне «Русатам — Лічбавыя рашэнні».

— У найбліжэйшы час мы будзем падпісваць ужо ліцэнзійныя пагадненні па асобных прадуктах. Напрыклад, пагадненне ў галіне рабатызацыі ў плане забеспячэння лічбавай аўтаматызацыі руцінных бізнес-працэсаў, што дазволіць паскараць бізнес і павышаць яго якасць, — заўважыў **Станіслаў ЛЯВІЦКІ, дырэктар краінавага офіса Дзяржкарпарацыі «Расатам» у Беларусі.**

Энергетычная і экалагічная эфектыўнасць

Для забеспячэння краіны чыстай энергіі да 2025-га за кошт уводу ў эксплуатацыю БелАЭС у краіне плануюць зменшыць выкарыстанне газу для вырабу цяпла і энергіі на 60 %, што ў сваю чаргу паменшыць выкіды вуглякіслага газу на 7 млн тон штогод.

У свеце няма ніводнай краіны (незалежна ад таго, ці маюць яны запасы ўласных энергарэсурсаў), якую б не непакоілі пытанні энергетычнай бяспекі і незалежнасці, перакананы **Віталь КРЭЦКІ, дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці:**

— Паказчык энергетычнай незалежнасці Беларусі сёння — каля 28 %, 17 % з якіх мы атрымліваем за кошт уласных энергарэсурсаў, то-бок з 10,5 тысячы ўсіх энергакрыніц у краіне больш за 50 % працуе на мясцовых відах паліва (кожная трэцяя гігакалорыя вырабляецца з уласнага паліва). А з 1993 года энергаёмістасць валавага ўнутранага прадукту зніжана практычна на 80 %, што ўдвая інтэнсіўней, чым у свеце.

Мемарандум аб узаемаразуменні падпісалі на форуме Дзяржкарпарацыі па атамнай энергетыцы «Расатам» і Мінпрыроды.

— Паслядоўная рэалізацыя дзяржаўнай экалагічнай палітыкі краіны, у тым ліку ў рамках кліматычнага парадку дня, скіравана на захаванне ўнікальнага прыроднага асяроддзя для паўнавартаснага жыцця людзей, — пракаментаваў **Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.** — У гэтай сувязі мы разглядаем далейшае развіццё ўзаемавыгадных партнёрскіх стасункаў з «Расатамам» па пытаннях аховы навакольля.

Патэнцыял Дзяржкарпарацыі і яе кампетэнцыі дазваляюць значна пашырыць адносіны па фарміраванні адзіных навукова-даследчых падыходаў і агульнай пазіцыі, якая базіруецца на прынцыпах эканомікі замкнёнага тыпу, пагадзіўся **Андрэй ЛЕБЕДЗЕЎ, дырэктар кірунку па рэалізацыі дзяржаўных і галіновых праграм у сферы экалогіі Дзяржкарпарацыі «Расатам»:**

— Падпісанне стала стартам новага сур'ёзнага этапу развіцця ўзаемаразумення і перспектыўу паспяховага супрацоўніцтва ў сферы экалагічнай бяспекі пры рэалізацыі высокатэхналагічных інвестпраектаў.

Ірына СІДАРОК,
фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЯК ПАКОРМІШ — ТАК І НАДОІШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладанні «Каўпень-Агра» — тры тысячы галоў буйной рагатай жывёлы. Дойны статак — 1300 кароў. Штодня гаспадарка вырабляе і пастаўляе на Тураўскі малочны камбінат 22 тоны малака. Пры сярэднім па краіне надоі — 16 літраў малака на карову, у мясцовых аграрыяў гэты паказчык — звыш 19 літраў.

— Вельмі адказны ўчастак работы ў гаспадарцы — работа з цялятамі: ад таго, як спрацуе звяно, залежыць уся далейшая работа, перакананa **жывёлавод па дарошчванні маладняку МТФ «Казярогі» ААТ «Каўпень-Агра» Таццяна АНІКЕЕНКА.**

На ферме ў «Казярогах» працаўніца рупіцца, колькі сябе памятае. Яе мама таксама ўсё жыццё тут жа прапрацавала цялятніцай. Таццяну з самага дзяцінства брала з сабой на ферму. Сама працаўніца ўжо трэці год як на пенсіі, але працягвае працаваць. На яе ўчастку праца адказная, але любімая.

— Цяляткі як дзеці маленькія, увага ім павышаная. «Цялячыя пяшчоты» — нездарма так кажуць — страшна цікаўныя і вельмі любяць лізацца, — расказвае жывёлавод.

Удаецца якраз паназіраць, як працаўніца даглядае маленькіх. Некаторыя нарадзіліся толькі некалькі гадзін таму.

— Самых малодшых кормім, вядома, малаком. Малодзіва працэджваем, падагравaем да 38 градусаў і з соскі даём. Тых, хто старэйшы, ужо прывучаем да цвёрдай ежы — сена і травянога корму, — тлумачыць жанчына. — Цяпер новую групу малых набіраю — 16 цялят мне і столькі ж напарніцы. Пакарміць, папаіць, падасласць саломкі — нашы абавязкі.

На ўчастку работы Таццяны Анікеенкі добра можна прасачыць, як арганізавана «жыллёвае пытанне» маладога папаўнення статку. Калі нараджаецца цяля, яго пасляюць у асобную маленькую хатку — станок, як кажуць жывёлаводы.

— Падрослых з «ясляў» пераводзім у «дзіцячы садок» — індывідуальныя загончыкі, дзе ўжо прасторней.

Жывёлавод паказвае месца, дзе цяпер якраз ідзе будаўніцтва новага «дзіцячага садка» для цялят. На МТФ «Казярогі», як і ўвогуле ў іх гаспадарцы, будуюць усе памяшканні сваімі сіламі: ёсць свая брыгада.

— Да халадоў малыя будуць ужо ў новых загончыках жыць, — радуецца цялятніца.

На малочнатаварнай ферме «Каўпень-Агра» працуе перасоўны даільны комплекс. На ім доіцца 100 кароў, і з кожнай каровы штодзень атрымліваюць 30 літраў малака. Па такім жа прынцыпе даільны працэс наладжаны і на малочнатаварнай ферме гаспадаркі «Крупейкі».

— Прэзідэнт засяроджвае ўвагу аграрыяў на тым, каб з меншымі затратамі вырабляць больш прадукцыі, — падкрэслівае **кіраўнік праекта ААТ «Каўпень-Агра» Пётр НОСІКАЎ.** — У нас у гаспадарцы няма новых пабудоў. Прыводзім у парадак і рамантуем існуючыя будынкі. Ставім перасоўныя даільныя ўстаноўкі, якіх першапачаткова ў гаспадарцы не было. Затое меліся памяшканні, якія неэфектыўна выкарыстоўваліся. Навялі парадак. Стацыянарныя даільныя залы захоўваем, а ў адрамантаваных памяшканнях на перасоўных даільных установках вытворчасці «Гомельагракамплекта» дояцца першацёлкі. На абсталяванні ўстаноўлена аднолькавая частата даення, што дазваляе браць малако ад маладой жывёлы без болю для яе. Гэта дае магчымасць яшчэ больш нарасціць вытворчасць малака, — тлумачыць Пётр Іванавіч.

Гаспадарка ААТ «Каўпень-Агра» на Лоеўшчыне — адно з дзевяці сельгаспрадпрыемстваў па ўсёй краіне, што ўваходзяць у холдынг «Малочная праўда». Гаспадарка ў Каўпені ў свой час знаходзілася ў дрэнным стане. Інвестар захаваў не толькі працаўнікоў, але і ўсю старую інфраструктуру. Сёння мясцовы калектыў — амаль 200 чалавек. Прыязджаюць працаваць у Каўпень жыхары з розных населеных пунктаў раёна. Тут увогуле не ведаюць, што такое цякучка кадраў. Вакансій няма.

— У нас шмат працуе моладзі. Увогуле, усе маладыя спецыялісты, якія прыйшлі ў свой час на працу пасля вучобы, падпісалі кантракты і засталіся з задавальненнем, — дадае кіраўнік гаспадаркі.

Цікава, што ў гарачы для сельгаспрадпрыемства час — нарыхтоўкі кармоў намеснік дырэктара і старшы персанал выходзяць дапамагаць на самых адказных участках.

— Наша задача — нарыхтаваць 34 кармавыя адзінкі на адну ўмоўную галаву жывёлы, з планам дакладна справімся да першага лістапада, — звяртае ўвагу Пётр Носікаў на адметны ў жывёлагадоўлі паказчык.

У гэтым сезоне гаспадарка нарыхтуе 24 тысячы тон сіласу, ужо закладзена 20 тысяч тон, чатыры тысячы тон корму плануюць рэалізаваць сельгаспрадпрыемствам.

— Каб забяспечыць збалансаванае кармленне, выкарыстоўваем сілас, сянаж і плюшчаную кукурузу: увогуле не закупляем камбікорму, а ўсё ідзе ўласнай вытворчасці. Каб не несці выдаткі на сушку, размолку 1500 тон плюшчанай кукурузы закладваем адразу ў поліэтыленавыя рукавы. Гадавая патрэба такога корму — 1200 тон. Да першага снежня ў нас для кармлення жывёлы яшчэ застаецца леташні запас. Яго захавальнасць у поліэтыленавых рукавах — 100 %. Так, без страты якасці захоўваць ураджай можна да двух гадоў. Як вынік — эканамічная выгада. Добрая якасць кармоў дазваляе захоўваць высокія надоі малака. Павялічваюцца і сутачныя прыбаўленні ў вазе жывёлы, — дадае суразмоўца.

Цяпер у гаспадарцы працягваецца нарыхтоўка царыцы палёў на сілас.

Захаванне тэхналогій дае магчымасць падрыхтаваць паўнавартасны і якасны корм. У гэтым сезоне мясцовыя аграрыі закладваюць чатыры сянажна-сіласныя траншэі. Дарэчы, закладка сіласу ідзе ў новыя збудаванні. У гаспадарцы разабралі старыя будынкі, якія не выкарыстоўваюцца, і з гэтых матэрыялаў па ўсіх тэхналогіях паставілі новыя траншэі, дзе будзе захоўвацца корм.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Каб помнілі

ГЭТА ТРЭБА НЕ МЁРТВЫМ! ...ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ!

Лічбы не хлусяць: апошнім часам і, калі можна так сказаць, ударнымі тэмпамі развіваецца ўнутраны турызм — экскурсійны, санаторна-аздараўленчы, гістарычны...

Вёска Ала — сястра Хатыні. «Сцежка да Алы» — адзіны ў Беларусі маршрут эколага-патрыятычнай накіраванасці, распрацаваны па ваенна-тапаграфічнай карце 1936 года і пракладзены па адзінай існуючай у той час дарозе, якая вяла да вёскі. Ён пачынаецца на экабазе «Урэчча», далей — кароткі шлях на маторнай лодцы па рацэ Бярэзіне, па прыродных, натуральных біяцэнозах заказніка «Выдрыца» да мемарыяльнага комплексу «Ала».

Апісанне маршруту я знайшоў на сайце заказніка і чамусьці вырашыў, што пачаць яго варта з канца.

Да мемарыяльнага комплексу, дзе нашу невялікую групу ўжо чакаў работнік заказніка, дабрацца было зусім нескладана: з шашы Жлобін — Светлагорск туды вядзе асфальтаваная дарога. На месцы — кароткі інструктаж і экскурсія.

Першае, што ўразіла ў самым пачатку, — арка з шэрага бетону з надпісам: «Памяці бязвінных ахвяр нацысцкай карнай аперацыі 14 студзеня 1944 года».

Гэта значыць, перад самым вызваленнем, напрыканцы вайны. Як гэта крыўдна і страшна...

Думкі перапыніў аповед гіда. У вёсцы Ала, якая знаходзілася ў глухім лесе, наводшыбе, да пачатку вайны было 34 хаты, 168 сваіх, тутэйшых жыхароў. Сюды ж, уцякаючы ад вайны, сцякаліся насельнікі іншых, суседніх вёсак. Немцаў не было...

Па ўспамінах тых, хто выжыў, стала вядома, што ў апошнія дні 1943-га на месце праз раку Алу нехта забіў нямецкага афіцэра. У адплату за гэта 14 студзеня, на

досвітку, вёску ачапілі паліцаі і нямецкія салдаты. Пад выглядам перапісу, людзей сагналі ў вялікую адрыну, потым па 40—50 чалавек выводзілі, замыкалі ў хатах ды іншых пабудовах і падпальвалі.

Тых, хто не хацеў ці не мог ісці, расстрэльвалі на месцы. Уратаваліся толькі восем жыхароў. Нехта паспеў уцячы і схавацца ў лесе, камусьці пашчасціла вырвацца з агню, сысці ад аўтаматных і кулямётных чэргаў. Іх успаміны сабраныя ў фондах Светлагорскага гісторыка-краязнаўчага музея...

Слухаючы экскурсавода, мы праходзілі па былой галоўнай вуліцы вёскі. Над нашымі галовамі праплывалі аркі з жахлівымі лічбамі: «950 дзяцей», «508 жанчын», «100 мужчын і 200 састарэлых жыхароў»... У Але, адной беларускай вёсцы, загінула насельніцтва 12 Хатыняў... Удалечыні, візуальна перакрываючы шлях, віднеўся надпіс: «Мы жывыя, пакуль нас помняць».

Далей была адкрытая пляцоўка ў цэнтры комплексу, помнік з безліччу кветак і дзіцячых цацак, з маўклівым звонам, злева ад якога — арка з 12 меншымі званамі і назвамі 12 вёсак: Чыркавічы, Здудзічы, Ракшын, Рудня, Іскра, Светач, Дзеднае, Каратковічы, Плясовічы, Антонаўка, Сельнае, Мармаль. Іх жыхары таксама загінулі ў Але.

На ўсёй тэрыторыі комплексу ўзвышаюцца каменныя барэльефы. На адным жанчына сабою затуляе дзяцей ад агню...

На вочы міжволі набягаюць слёзы, у памяці ўсплываюць кадры з фільма «Ідзі і глядзі»: падпаленыя хаты, жахлівыя крыкі, стогны людзей і смех карнікаў.

Напэўна, такія ж думкі ў маіх спадарожнікаў, якія разбрыліся па тэрыторыі і моўчкі вывучалі надпісы. Ля падножжа 12 званоў адна з дзяўчат паклала палявыя кветкі. А ў мяне з сабою — да сораму — у руках анічога...

Мае спадарожнікі адчувалі, напэўна, тое ж, бо хутка побач з букетам апынуліся аўтаручка, сцізорык, люстэрка, яркая заколка... Усе мы — не па камандзе — сталі ў шэраг і схілілі галовы. Час запаволіўся, ён стаў вечнасцю для дзяцей, жанчын і старых, пахаваных пад гэтымі камянямі.

...Наш далейшы маршрут пралягаў па лесе, аднак, ідучы побач з гідам, я амаль не чуў яго слоў: проста дыхаў восенню, слухаў шолах лістоты і шапаценне травы пад нагамі — радаваўся яшчэ цёпламу сонцу і міру. А ўжо ў канцы шляху, перад пасадкай у лодку, міжволі азірнуўся назад на сцежку і, здаецца, яшчэ раз, з лесу, пачуў: «Мы жывыя, пакуль нас памятаюць». А потым падумаў: «Мы жывыя, пакуль ёсць памяць пра вас».

Вадзім Кандрашонак,
фота аўтара.

Гомельская вобласць.

Фота слова

Куст язміна бухматы
Сёння ў шыбіну б'ецца,
Лісце просіцца ў хату
Ад імжы адагрэцца...
Каляндар адмярае
Час асенні няспынна,
Дык чаму ж не мінае
П'яны водар язміну?

Нібы чую з нябёсаў
Жаўруковы званочкі,
Вабяць росныя плёсы
Святаянавай ночкі...
Мо прысніцца гэта?
Што за дзіва такое?
Гэта — бабіна лета,
Успамін пра былое.

Чалавек – чалавеку

НЕХТА ГУБЛЯЕ, НЕХТА ЗНАХОДЗІЦЬ

Добра жыць на ўскрайку горада, там дзе побач лес, у якім, што называецца, гуляй — не хачу, хоць адзін, хоць з сабачкам.

— Жулька, сядзець! — загадала Пятроўна свайму гадаванцу, ужо нахадзіўшыся і сама прысеўшы на лавачку ля пад'езда.

Сабачка — чорна-беленькі, маленькі, з хвосцікам-дроцікам паслухмяна ўладкаваўся побач ды хіба што «пытаўся» (пастрэльваў вочкамі-слівамі), можа цяўкнуць, калі нехта праходзіць, ці лепей не?

— Вырас ваш цюцька, — гледзячы на яго, усміхнулася суседка. — Мо як у вершы: «...за время пути собачка могла подрасти»?

— Не, гэта парода такая. Ён дарослы ўжо... Невядома, чый, — гладзячы сабачку, уздыхнула Пятроўна. — Прыладзіўся неяк за веласіпедам бегчы, калі муж на лецішча ехаў, потым цэлы дзень пад колам яго прачакаў — «праводзіў» пад самы дом... Тут мы яго і пакінулі. Разумны: усіх сваіх ведае — і дзяцей, і ўнукаў... А ўжо культурны які: пакуль лапкі не памыем, у пакой ніколі не пойдзе. Любім мы яго: і муж, і я...

Нехта заўсёды чакае (а мо і шукае?) нашай любові.

Шчасце, калі знаходзіць.

Ірына Войтка,

г. Слонім.

Уражанні

З ПЯШЧОТАЙ, З ХВАЛЯВАННЕМ — ПРА КАХАННЕ

Нядаўна ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла кніга вядомага пісьменніка, публіцыста, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Зіновія Прыгодзіча «Цяпло позняй восені», якая прыцягвае ўвагу з першай жа старонкі, бо цалкам прысвечана каханню.

Ва ўступным слове аўтар піша: «Высокі Божа, перахапляе дыханне і кружыцца галава, калі думаеш, колькі геніяльных людзей прысвяцілі гэтаму бясцэннаму скарбу сэрца свае самыя ўзнёслыя, самыя пранікліявыя радкі... Здаецца, пра каханне ўжо сказана ўсё... І, тым не менш, кожная закаханая душа, не задавальняючыся чужымі, хай сабе і геніяльнымі, радкамі, імкнецца выспець уласныя словы, знайсці ўласныя фарбы і адценні. Таму, колькі б ні было напісана пра каханне, яго навізна, яго драматызм, яго разнастайнасць не могуць быць вычарпаныя, пакуль жыве чалавек на Зямлі, пакуль б'ецца яго сэрца...»

Як і гэтая натхнёная прадмова, кніга Зіновія Прыгодзіча вельмі шчырая, пранікнёная, спавядальная. Гаворачы аб каханні, шчаслівым або нераздзеленым, аўтар у сваіх аповесцях і апавяданнях паказвае, якой моцнай павінна быць душа, каб на паваротных этапах жыццёвага шляху чалавек мог зрабіць правільны выбар, прыняць адзіна дакладнае рашэнне. Вернасць і здрада, яснасць і неразуменне, шчасце і няўдачы заўсёды ідуць побач. Пераадолець цяжкасці і перамагчы — гэтаму вучыць пісьменнік. Яго героі праз душэўныя пакуты, доўгія тужлівыя разважанні прыходзяць да вышэйшага разумення кахання, якое патрабуе і самаахвяравання, і адвагі.

Да галоўнай гераіні аповесці «Цяпло позняй восені» гэтае пачуццё прыходзіць у вельмі паважаным узросце, да таго ж яно не можа быць узаемным. Нястрымна гарачыя лісты жанчыны, звернутыя да каханага, ашаламляюць сваёй адкрытасцю: яны абрыньваюць на галоўнага героя цэлы ніягарскі вадаспад прызнанняў, якія ён прыняць не ў стане, ды яны яму і не патрэбныя, бо ў яго свая шчаслівая сям'я...

А для жанчыны гэты нясцерпны і неадступны неспатолены смутак становіцца фатальным: слабае сэрца не вытрымлівае моцнага напалу пачуццяў.

Аповесць выклікае адчуванне рэальнай трагедыі. Хочацца паспачуваць той няшчаснай гераіні, а галоўнаму герою пажадаць мужнасці прынесці сваё пакаянне ў храм на споведзь, каб ён не мучыўся думкамі аб тым, што сваёй нелюбоюю наблізіў сыход з жыцця жанчыны, якая так пакутліва кахала яго. «Несвоевременность — вечная драма, где есть Он и Она», — як спяваў незабыўны Ігар Талькоў.

У аповесці «Чаромхавыя халады» гераіня валодае прыроднай прывабнасцю, якая памнажаецца зачараваннем яе загадкавай і неспасцігальнай душы. Закаханага юнака гэта дзяўчына прыцягвае, але адначасова і мучыць. Ён ніяк не можа зразумець, ці кахае яна яго. Не дазваляючы ніякіх вольнасцяў і ведаючы сілу сваёй прыгажосці, яна распальвае яго, пакідаючы пры гэтым у няпэўнасці: ці ёсць пачуццё ў адказ, якое магло б стаць усёпераможным?..

Несупадзенне — частая прычына гісторый, прадстаўленых і ў апавяданнях пісьменніка. Няма агульных інтарэсаў, імкненняў, тэм для размоў, а значыць, няма і таго галоўнага, чым умацоўваецца саюз двух людзей. Але тады навошта патрэбны ўсе гэтыя пакуты, бяссонныя ночы і ўрэшце — балючы разрыў? Аказваецца, усё, што нам даецца ў жыцці, становіцца ўрокам для нас: каб мы гартаваліся, мацнелі, набіраліся досведу, выпраўлялі свае памылкі. А доўгачаканы чалавек, як правіла, рана ці позна прыходзіць. Значыць, усё перажытае было не выпадкова...

Вобразы сціплых і смелых, стрыманых і палкіх жанчын жывуць на старонках гэтай кнігі. Яны выпісаны вельмі ярка, з улікам індывідуальных асаблівасцяў кожнай з гераінь. Але ёсць у іх шмат агульнага, што родніць усіх жанчын на свеце, — імкненне да мары. Кожная хоча сустрэць свайго суджанага і закахацца — самаахвярна, аддана, да самазабыцця. Значыць, трэба марыць, рыхтаваць сябе да разумення галоўнага — і тады каханне абавязкова спраўдзіцца.

Гэта пацвярджае і герой апавядання «Сузор'е Касіяпеі», які пакрыўджаны ў тым, «што кожнага чалавека чакае яго адзіная палавінка, трэба толькі мець цярпенне і ўменне разгледзець гэтую палавінку».

Валянціна ПАЛІКАНІНА,

г. Мінск.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
18 кастрычніка 2023 г. № 38 (724)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Традыцыйным сямейным каштоўнасцям — асаблівая ўвага

Члены Савета Рэспублікі правялі прамыя тэлефонныя лініі па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і

Вопыт зваротнай сувязі з грамадзянамі ў фармаце дыялогу па тэлефоне — не новы. Сенатары пастаянна знаходзяцца ва ўзаемадзеянні з насельніцтвам: сустракаюцца з працоўнымі калектывамі, рэгулярна праводзяць асабістыя прыёмы грамадзян, ладзяць прамыя тэлефонныя лініі. Аб эфектыўнасці такой формы работы з жыхарамі сведчаць шматлікія вырашаныя пытанні: людзі ўладкоўваюцца на работу, паляпшаюцца іх жыллёвыя ўмовы, вырашаюцца зямельныя пытанні, маленькія пацыенты з рэдкімі генетычнымі захворваннямі атрымліваюць дарагія прэпараты. І гэта, вядома, далёка не ўсе прыклады пільнай увагі членаў Савета Рэспублікі да праблем людзей. Прамыя тэлефонныя лініі па сямейных пытаннях былі праведзены ўпершыню і склалі трыяду мерапрыемстваў Савета Рэспублікі да Дня маці, прысвечаных умацаванню статусу сям'і і сямейных каштоўнасцяў у Беларусі. Сенатары ва ўсіх рэгіёнах краіны адказалі на пытанні грамадзян. Сведкамі размовы некаторых парламентарыяў з насельніцтвам сталі карэспандэнты «Звязды».

Фота БелТА.

АД ЖЫЛЛЯ ДА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ звярталіся з самымі рознымі пытаннямі. Спікер не паспявала завяршыць адну размову, як раздаваўся новы званок. Кожная просьба была не падобная на папярэднюю. Сям'я, якая выхоўвае дзіця-інваліда, прасіла пасадзейнічаць у паляпшэнні жыллёвых умоў, бабуля выказала свае сумненні ў справядлівасці вынясення прыгавора яе непаўналетняму ўнуку. Шэраг пытанняў датычыліся маёмасці: адны скардзіліся на нерацыянальны падзел жылплошчы паміж былымі сужэнцамі, іншыя вымушаны дзяліць жыллё з махлярамі, якім уладальнік перапісаў палову хаты.

З вуснаў грамадзян гучалі і канкрэтныя прапановы. У прыватнасці, жыхара сталіцы хвалюе слабае экскурсійнае суправаджэнне патрыятычнага выхавання дзяцей у школах. Па меркаванні Анатоля Рыгоравіча, школьнікі наведваюць мемарыяльныя комплексы, аднак экскурсіі праводзяцца не заўсёды. «Проста наведваць такія месцы з кветкамі — бясспрэчна, важна, але калі дзецям глыбока расказваецца аб усіх нюансах, якія там адбываліся, — важней», — лічыць грамадзянін. Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, работа па патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення праводзіцца дастаткова шырока. «Я ведаю не па чутках, што дзяцей з экскурсіямі вывозяць і ў Хатынь, і ў Чырвоны Бераг, іншыя памятныя месцы — менавіта з экскурсій, — адзначыла яна. — Неўзабаве ў нас адбудзецца вялікае мерапрыемства з удзелам міністра адукацыі, мы яшчэ раз зробім акцэнт на гэтым пытанні».

Акрамя таго, грамадзянін заўважыў, што фармулёўка «подпіс законных прадстаўнікоў», змешчаная ў школьных дзённіках, не зусім карэктная, бо дзеці часта смяюцца з гэтага і называюць уласных бацькоў законнымі прадстаўнікамі. Наталля Качанава пагадзілася з неадназначнасцю фармулёўкі. Як стала вядома на момант публікацыі, Мінадукацыі ўнесла змены, і цяпер замест «подпіс законных прадстаўнікоў» у школьных дзённіках будзе ўказвацца «подпіс бацькоў».

Занепакоенасць выхаваннем дзяцей у інфармацыйным асяроддзі выказала мінчанка Юлія Уладзіміраўна. Жанчына — мама траіх дзяцей, і яна катэгарычна супраць таго, як адзін з блогераў прапагандуе ў сваім тэлеграм-канале антычалавечыя каштоўнасці. З падобнай скаргай да Наталлі Качанавай ужо звярталіся, і яна паабяцала, што абавязкова разбярэцца з гэтым пытаннем.

Слушная прапанова прагучала і ад дырэктара зоаабарончай установы. Жанчына лічыць, што сем'і, дзе дапускаецца факт жорсткага абыходжання з жывёламі, неабходна ставіць на ўлік як тых, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Ірына расказала пра выпадак у Брэсце, калі дарослы чалавек у прысутнасці сваіх дваіх дзяцей выкінуў з восьмага паверха ката — падчас падзення жывёла атрымала траўмы, несумяшчальныя з жыццём. Наталля Качанава адзначыла, што пытанне, з якім звяртаецца грамадзянка, патрабуе ўважлівага вывучэння. Яно не новае для парламентарыяў: спікер расказала, што ў цяперашні час ідзе работа над законапраектам «Аб адказным абыходжанні з жывёламі», які ўжо ў першым чытанні прыняты дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. Праект закона накіраваны на замацаванне агульных прынцыпаў і норм прававога рэгулявання ў сферы абыходжання з жывёламі, прасоўванне ідэй маральных і гуманных адносін да іх, павышэнне адказнасці ўладальнікаў жывёл.

Адна з жанчын пацікавілася, ці працягнецца дзяржаўная падтрымка сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеці. «Прэзідэнт шмат разоў гаворыць, што для нас самае галоўнае — гэта людзі, — падкрэсліла Наталля Качанава. — А тыя жанчыны, якія нараджаюць дзяцей, заўсёды былі ў прыярытэце. Наша палітыка нязменная. Мы выступаем толькі за тое, каб нашы маладыя людзі разумелі: самае галоўнае, што ёсць у чалавека, — гэта сям'я, дзеці, якіх ён павінен нарадзіць і выхаваць. Выхаваць дзіця — гэта самая складаная праца. Траіх і больш — заслугоўвае ўсялякай павагі. Гэтыя сем'і ў нас у пашане».

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Устойлівае развіццё, платформенная занятасць, дыялог з моладдзю

Сенатары на тыдні працавалі па розных тэмах

Пад кіраўніцтвам **намесніка старшыні Савета Рэспублікі, Нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР) Валерыя БЕЛЬСКАГА** адбылося пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці.

Падчас мерапрыемства ўдзельнікі абмеркавалі пытанні трансфармацыі адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця і партнёрства з краінавай камандай ААН у Рэспубліцы Беларусь у гэтым кантэксце; работу Маладзёжных паслоў МУР трэцяга склікання; вынікі ўдзелу дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Саміце па МУР у верасні 2023 года.

У сваім выступленні Валерый Бельскі падкрэсліў, што развіццё адукацыі як сферы менеджменту чалавечых рэсурсаў выступае найважнейшым фактарам росту эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці эканомікі, які падтрымліваецца інавацыйнай палітыкай дзяржавы ў інтарэсах дасягнення глабальных Мэт устойлівага развіцця. Беларусь надае гэтаму вялікае значэнне, і эфектыўнасць мер, якія прымаюцца, пацвярджаюць высокія пазіцыі краіны ў сусветных рэйтынгах.

«Кіраўнік дзяржавы неаднаразова называў адукаванага чалавека галоўным рэсурсам нашай краіны, — сказаў віцэ-спікер. — Па сутнасці, мы можам казаць пра беларускую адукацыю як пра візітоўку Беларусі».

* * *

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у рэжыме відэаканферэнцсувязі прыняла ўдзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах і першым арганізацыйным пасяджэнні рабочай групы па распрацоўцы праекта мадэльнага закона «Аб платформенной занятасці».

На пасяджэнні разгледжаны шырокі спектр праектаў мадэльных заканадаўчых актаў у сферах стандартызацыі, занятасці, падаткаабкладання і інш. Таксама парламентарыі абмеркавалі Рэкамендацыі па развіцці супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у сферы эканамічнай бяспекі.

Парламентарый агучыла пазіцыю профільных дзяржаўных органаў Беларусі па названых дакументах і прапанавала ўлічыць прапановы беларускага боку пры іх дапрацоўцы.

* * *

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алег ДЗЯЧЭНКА выступіў на дыялогавай пляцоўцы па абмеркаванні актуальных пытанняў дзейнасці грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Асаблівая ўвага была сфакусіравана на рэалізацыі новай маладзёжнай ініцыятывы — стварэння на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі. «У нашай краіне пытанне захавання гістарычнай памяці, выхавання школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў, працоўнай моладзі на гераічных традыцыях беларускага народа з'яўляецца ва ўсіх адносінах стратэгічным, — адзначыў парламентарый. — Мы падтрымліваем ініцыятыву нашай маладзёжнай арганізацыі і мяркуем, што рэалізацыя прапанаванага рэспубліканскага праекта дазволіць узняць на якасна новы ўзровень грамадзянскае і ваенна-патрыятычнае выхаванне юных беларусаў, узмацніць іх матывацыю і гатоўнасць да абароны нацыянальных інтарэсаў, суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці беларускай дзяржавы».

АД ЖЫЛЛЯ ДА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Як рэзюмавала ў размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі, прамыя тэлефонныя лініі з'яўляюцца для сенатараў традыцыйнай формай работы з людзьмі, аднак напярэдадні Дня маці тэматычны акцэнт быў зроблены на сямейных каштоўнасцях. Ім у нашай краіне надаецца асаблівая ўвага, падкрэсліла Наталля Качанава. Калі працавала Канстытуцыйная камісія, паступіла вельмі шмат прапаноў, якія датычыліся менавіта гэтай тэматыкі.

Падчас прамой тэлефоннай лініі спікер верхняй палаты парламента ўбачыла, што многіх грамадзян хвалюе пытанне патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення. «Былі прапановы, якія датычыліся рэгулявання інфармацыйнай сферы, — канкрэтызавала яна. — Бацькі занепакоеныя тым, што ў інтэрнэце дзеці могуць убачыць прапаганду нетрадыцыйных каштоўнасцяў. Вядома, мы, як заканадаўцы, павінны думаць пра гэта».

Некаторыя пытанні датычыліся падзелу маёмасці. «Нават тады, калі людзі дастаткова доўга пражылі ў шлюбе, даводзіцца дзяліць маёмасць, і гэта заўсёды праблемна, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Як правіла, гэта судовыя цяжбы. Ужо неаднаразова ўзнімаецца пытанне аб падзеле маёмасці сем'яў, якія сумесна будавалі жыллё з дзяржаўнай падтрымкай — нашы шматдзетныя сем'і. Такіх зваротаў было дастаткова шмат яшчэ раней. Таму цяпер мы хочам комплексна падысці да вырашэння гэтага пытання: каму выдзяляецца субсідыя, як, хто яе атрымлівае, потым пры раздзеле маёмасці каму аддаваць прыярытэт? Зразумела, гэта рашэнне судоў, але часам ёсць выпадкі, калі людзі скардзяцца на тое, што мама застаецца з трыма дзецьмі і ёй вылучаюць 50 % плошчы кватэры, а 50 % плошчы адыходзіць бацьку, з якім яны разведзены. Думаю, што гэтыя сітуацыі мы яшчэ глыбока і дэталёва разбяром з улікам акцэнту, які зрабіў Прэзідэнт: куды накіроўваюцца сродкі, што выдзяляюцца на падтрымку сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Гэта трэба ўзяць на кантроль і нам, членам Савета Рэспублікі, для таго, каб яны (сродкі, што выдзяляюцца дзяржавай. — **«Зв».**) выкарыстоўваліся эфектыўна і ішлі на карысць той сям'і, якая добрапрыстойна выхоўвае дзяцей і дзеці ў такой сям'і адчуваюць сябе шчаслівымі».

Адна з жанчын пацікавілася, якім чынам улада будзе правяраць, добра выхоўваюць дзяцей ці дрэнна. Па словах спікера, тут усё проста. «У нас дастаткова шмат дзяржаўных устаноў, якія могуць бачыць, наколькі шчаслівая ці нешчаслівая сям'я і як там жывуць дзеці, — патлумачыла Наталля Качанава. — Найперш гэта сістэма адукацыі, сістэма аховы здароўя, а таксама службы МНС і ЖКГ, якія працуюць ва ўзаемадзеянні. Калі выяўляецца пэўнае няшчасце, яны адразу ж павінны інфармаваць аб гэтым, каб прымаліся меры ў абарону дзяцей. Чаго ўтойваць, у нас ёсць дзеці, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, ёсць сем'і, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Біялагічнае сіроцтва — гэта трагедыя, бяда, як і сацыяльнае сіроцтва, калі дзеці пры жывых бацьках выхоўваюцца ў інтэрнатных установах, і дзяржава бярэ на сябе гэтыя функцыі. Хоць мы добра разумеем, што кожнае дзіця хоча жыць з бацькамі, хоча жыць у сям'і».

Старшыня Савета Рэспублікі канстатавала, што прамая тэлефонная лінія пацвердзіла тое, што людзей хвалююць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Па яе словах, прапановы, якія ўносіліся грамадзянамі, абавязкова будуць карысныя для заканатворцаў.

Вераніка КАНЮТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

ПРОСЬБЫ, ПРАПАНОВЫ І ПАДЗЯКІ

выслухаў па тэлефоне Валерый БЕЛЬСКІ

Зразумець, што здарылася ў чалавека, і выслухаць яго па тэлефоне — справа не надта простая. Адным хапае некалькіх хвілін, каб агучыць сваё пытанне, другіх трэба супакойваць, каб зразумець, чым дапамагчы, а трэцім дастаткова крыху пачакаць, каб адказ для іх знайшоўся непасрэдна падчас размовы. Большасць пытанняў тых, хто дазваніўся на нумар намесніка старшыні Савета Рэспублікі Валерыя Бельскага, датычылася якраз тэмы прамой лініі — сямейных спраў у самых розных аспектах.

Жаданне ёсць, а паўнамоцтвы знойдзем

Валянціна з Ляхавіч — ліквідатар аварыі на ЧАЭС, мае сацыяльнае жыллё і вельмі хоча «на старасці гадоў мець сваё»:

— Я вельмі ўсіх паважаю і люблю. Мне ніхто ніколі не адмаўляў, але ж хацелася б свой куток. Я тады гаспадарку кінула, сына пакінула ў маці і не ведала, як там што будзе, але ж паехала ліквідаваць наступствы аварыі.

Валерый Бельскі заўважыў, што папросіць кагосьці з брэсцкіх сенатараў разабрацца з пытаннем, бо «яна мае чарнобыльскую льготу як ліквідатар і сацыяльныя гарантыі»:

— У яе сітуацыі здарыліся нейкія розначытанні ў заканадаўстве, бо, калі чалавеку даецца магчымасць атрымаць сацыяльнае жыллё, ён не павінен губляць чаргу для тых, хто мае патрэбу ў гэтым.

Пенсіянер Мікалай з Мінска, які ахарактарызаваў сябе як неабыякавы і актыўны чалавек, прапануе зрабіць ільготы на праезд для тых, каму 70+. Яму 73 гады, і, на яго думку, у такім узросце ўжо сорамна ездзіць «зайцам», таму льгота была б у самы раз.

— Мы пенсіянеры, ды яшчэ і хворыя. Каб кудысьці з'ездзіць з перасадкай, трэба пракампаціраваць чатыры талоны. Было б добра зрабіць ільготны (на 50 %) праезд для тых, каму за 70 гадоў, як у прыгарадным транспарце падчас дачнага сезона. Я звяртаўся ўжо колькі разоў да дэпутатаў, а яны кажуць, што нічога не могуць вырашыць, няма ў іх паўнамоцтваў. Дык што, будзем чакаць, пакуль Прэзідэнт вырашыць пытанне?

Мінчанін упэўнены, што пенсіянеры таксама прыносілі б карысць і прыбытак дзяржаве, калі б ездзілі за палову аплаты, бо днём транспарт ходзіць амаль пусты.

— Звернемся ў Мінгарвыканкам з такой прапановай і абмяркуем яе з міністрам транспарту, — паабяцаў сенатар і запэўніў, што цалкам падтрымлівае гэтую ідэю і пастараецца пераканаць калег.

У садок каля дома

Анастасія з Мінска пазваніла, каб падзякаваць за тое, што пасля звароту да сенатара яе малы трапіў у дзіцячы садок каля дома. У канцы кастрычніка жанчына народзіць яшчэ адно дзіця, таму вельмі ўдзячная, што ў яе сітуацыі ўсё склалася добра:

— Мы паспяхова прайшлі адаптацыю ў садку. Там шыкоўны калектыў, мы адчуваем сябе так, нібы заўжды былі. І ваша дапамога не толькі ў тым, што садок непадалёку ад дома. Вы далі мне ўпэўненасць, што я не застануся адна, што ёсць да каго звярнуцца, і ўжо ад гэтага стала лёгка.

Валерый Бельскі быў прыемна ўражаны такой ацэнкай і пажадаў поспехаў у самай важнай справе, якую робіць маці. Ён падкрэсліў, што заўжды прыемна дапамагаць, але ж удвая прыемней, калі чалавек нагадвае пра сябе і распавядае, як вырашылася справа, з першых вуснаў.

Яна з Оршы пазваніла, каб падзякаваць сенатару: з яго дапамогай яе прынялі на работу ў фінансавую арганізацыю без выпрабавальнага тэрміну.

— Жанчына працавала ў філіяле банка, дзе неналежным чынам вёўся кадравы ўлік, і ёй не змаглі даць характарыстыку, якая патрабуецца для работы ў фінансавых структурах, а філіял перастаў існаваць, пакуль яна двойчы знаходзілася ў дэкрэце. У выніку ёй спачатку далі фармальную паперу, звестак у якой было недастаткова. Агульнымі намаганнямі знайшлі былога яе кіраўніка, які пацвердзіў добранадзейнасць жанчыны, — патлумачыў сенатар.

Ордэн Маці і палавая недатыкальнасць

«Чаму не даюць ордэн Маці жонцы?» — абураецца Уладлен з вёскі ў Кобрынскім раёне, у якога шасцёра дзяцей. Ён неаднаразова звяртаўся з гэтым пытаннем да ўлад, а ў адказ толькі абяцанкі. Дзеці не знаходзіліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, аднак спасылаюцца на тое, што сын старэйшы, якому цяпер 27 гадоў, у свае 16 меў правапарушэнне. Аднак на момант, калі яму было 14, пятаму споўніўся годзік, і тады ніякіх правапарушэнняў не было.

— Калі майму пятаму дзіцяці было тры гады, мне абяцалі «пачакай, узнагародзім», цяпер яму ўжо 14. Ордэны атрымалі матулі, у якіх дзецям і паўтара, і тры гады, і невядома, што можа адбыцца ў сям'і праз дзесяць гадоў. Камісія да нас прыязджала, а мне кажуць, што не могуць знайсці архіў, грошай няма ў бюджэце.

Сенатар звярнуў увагу на тое, што «ўзнагародаў даюцца тым, хто забяспечваў выхаванне, якое выключала ўцягванне дзяцей у супрацьпраўную дзейнасць. Пры наяўнасці правапарушэння ў дзіцяці атрымаць узнагароду амаль немагчыма». Аднак паабяцаў разабрацца ў сітуацыі, чаму ордэн не атрымалі своечасова, калі дзеці былі малыя.

Наталля з Мінска, маці першакласніка, занепакоена тым, што ў школе ўводзіцца прадмет «Палавое выхаванне», пра што яна прачытала ў інтэрнэце. Валерый Бельскі папрасіў жанчыну пачакаць і адразу ўдакладніў па тэлефоне ў спецыялістаў, ці так гэта.

Высветлілася, што ў школах ёсць факультатыў «Духоўна-маральнае выхаванне», які выкладаецца ў вучняў з дзявятага класа, але ж прапрацоўваецца пытанне ўвесці яго з пятага класа. Па словах Валерыя Бельскага, ад наведвання факультатыву бацькі могуць адмовіцца.

Пасля кароткай кансультацыі сенатар заўважыў:

— Тым не менш, пэўна, нейкія азы міжасабовых адносін паміж разнаполымі дзецьмі павінны быць атрыманы. Таксама важна даваць дзецям звесткі, якія спрыялі б прадухіленню супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх. Гэта не так кепска, бо не заўжды бацькі могуць усё патлумачыць. Думаю, адрасуем гэтае пытанне яшчэ сенатару Ірыне Старавойтавай, і тады больш дакладна вас праінфармуем.

Праз дзень высветлілася, што ўвядзенне абазначанага жанчынай курсу ў школе яшчэ толькі абмяркоўваецца. З Савета Рэспублікі накіравалі ліст у Мінадукацыі і Генпракуратуру з інфармацыяй аб занепакоенасці бацькоў, бо менавіта дадзеныя структуры — ініцыятары.

Праца па сіле

Святлана са Светлагорска перажывае за свайго сына Руслана, які жыве з сям'ёй у Рэчыцы і з 2017 года працуе ў мясцовым філіяле прадпрыемства «Гомельдрэў». Яго старэйшай дачцэ сем гадоў, сыну тры гады і малодшай дачцэ восем месяцаў.

— Паўгода ён быў на бальнічным, бо пашкодзіў нагу, яму рабілі аперацыю. Цяпер прымаецца рашэнне аб звальненні сына, бо ён не зможа працаваць у былых умовах, тым больш што ў яго праблемы і з сэрцам. Урачы ўсе кажуць, што работадаўца павінен знайсці магчымасць працы з такім жа памерам заробку. Аднак на рабоце лічаць, што раз ён не можа працаваць у цэху, дзе быў дагэтуль, то яго будуць звальняць. Цяпер чакаюць рашэння медкамісіі.

Сенатар паабяцаў, што патэлефануе дырэктару прадпрыемства і ўмяшаецца ў сітуацыю, каб высветліць, што можа зрабіць. І ўдакладніў, што да канца года сям'я Руслана павінна атрымаць жыллё, згодна з сёлетнім рашэннем Прэзідэнта наконт шматдзетных сем'яў, якія стаялі на чарзе да мая 2023-га.

У кожнага, хто пазваніў, Валерый Бельскі цікавіўся не толькі сітуацыяй, з якой яны звярнуліся, але і іншымі акалічнасцямі надзённага жыцця, для кожнага знайшліся словы падтрымкі і нават жарту (для многіх, як мне падалося, гэта стала надзеяй, што пытанне не застанецца ў паветры). А тых, хто тэлефанаваў падзякаваць за ўжо вырашанае пытанне, сенатар пазнаваў па некалькіх словах і сітуацыі.

Ірына СІДАРОК.

Рэцэпт вечнай маладосці

Ім падзяліўся галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы, сенатар Ігар КАСКО

Грамадзяне, якія патэлефанавалі на прамую лінію да члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігара Каско, ставілі пытанні, якія датычыліся маральных якасцяў моладзі, яе выхавання і правільных арыенціраў.

Магіляўчанка Ірына паведаміла, што яе знаёмыя заклапочаны размовамі вакол таго, што ў краіне разглядаецца магчымасць аб увядзенні ў школах спецыяльнай адукацыі з 1 класа. Маўляў, дзіця яшчэ не атрымала агульнай адукацыі, а яго ўжо плануюць спецыялізаваць. Гэта ні да чаго добрага не прывядзе, перажывае магіляўчанка. На выхадзе мы атрымаем вельмі вузканакіраваную і абмежаваную асобу.

— Гэтая тэма сапраўды мусіруецца сярод насельніцтва, — пагадзіўся з суразмоўніцай Ігар Каско. — Спецкласы фарміруюцца ў асноўным са старшакласнікаў, але гучаць прапановы, што трэба пачынаць рабіць гэта раней. Пытанне вельмі складанае і патрабуе вялікай увагі і прапрацоўкі.

З шэрагам прапаноў і заўваг звярнулася на прамую лінію шматдзетная маці. Надзея заклапочана нізкім узроўнем культуры моладзі, ужываннем школьнікамі ненарматыўнай лексікі. Ад яе паступіла прапанова адкрыць у Магілёве маладзёжны цэнтр, дзе дзеці мелі б магчымасць з карысцю для сябе бавіць час, танна і паўнавартасна паабедаць, сустрэцца са спецыялістамі накшталт псіхолагаў, свяшчэннікаў, выхавальнікаў, якія б маглі ім даць карысныя парады і адказаць на складаныя пытанні.

Жанчына таксама перажывае, што ў цэнтры Магілёва, непадалёк ад плошчы Славы, дзе адбываюцца ўсе важныя дзяржаўныя мерапрыемствы, адкрылася інтым-крама з кідкай шыльдай. Дзеці пытаюцца, што гэта за гуллівая пунсовая дама там намалявана, чым ставяць дарослых у няёмкае становішча.

Прагучала таксама прапанова, каб у заканадаўчых дакументах, дзе прапісана, што шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны, была зроблена папраўка — «па нараджэнні». Маўляў, калі ўсё пакінуць, як ёсць, трансгендар пасля аперацыі па змене полу зможа афіцыйна ўступіць у шлюб і нават усынавіць каго-небудзь.

Яшчэ адно пытанне датычылася ўсынаўлення. Прапанавана, калі бацькі дзіцяці загінулі, каб першарадным правам на яго ўсынаўленне валодалі менавіта сваякі. Былі скаргі на дэманстрацыю ў магілёўскіх кінатэатрах фільма, які забаронены ў Расіі.

Падводзячы вынікі прамой тэлефоннай лініі, Ігар Каско адзначыў, што ў нас шмат неабыякавых людзей, якім не ўсё роўна, што адбываецца вакол іх і дзяцей. Людзей сур'ёзна хвалюе тэма абароны сям'і, выхавання моладзі менавіта ў духу традыцыйных каштоўнасцяў. Відаць, што пытанні, якія абмяркоўваліся ў сем'ях і калектывах, не спантанныя.

— Я падазраю, што такія заўвагі ўзнікалі не толькі ў магіляўчан, — рэзюмаваў Ігар Каско. — Адзіная тэлефонная лінія ўсіх сенатараў дала магчымасць аднамомантна сабраць інфармацыю, якая хвалюе людзей, па ўсёй краіне. Калі ўсе пытанні будуць закумуляваныя ў Савеце Рэспублікі, мы зможам іх прааналізаваць. У далейшым гэта можа прывесці да змянення заканадаўчай базы або да распрацоўкі заканадаўчых пасылаў ці законаў, якія змогуць курыраваць гэтыя пытанні і ліквідаваць праблемныя моманты. Такая практыка аднамомантнай адпрацоўкі нейкіх асобных пытанняў па краіне вельмі карысная і ў будучыні абавязкова сябе апраўдае. На гэты раз мерапрыемства было арганізавана напярэдадні Дня маці і Тыдня бацькоўскай любові. Наша грамадства складаецца з сем'яў, гэтых маленькіх ячэек, і чым яны больш здаровыя і шчаслівыя, тым больш здаровае і шчаслівае будзе ўсё грамадства.

— Мне часта прыходзіцца сустракацца з моладдзю, і мяне трывожаць тыя ўстаноўкі, якія існуюць у іх асяроддзі, — адзначае сенатар. — Яны лічаць, што сям'я — гэта нешта другаснае, што можна жыць свабодна і без усякіх абавязацельстваў. Але ж сям'я — аснова ўсяго. А ўжо потым астатняе: кар'ера, асобасны рост і гэтак далей. У разуменні маладых сям'ю трэба стварацьдзесьці пасля 35 гадоў. Яны не разумеюць, што пасля 35 могуць узнікнуць складанасці з нараджэннем дзяцей натуральным чынам. Тады гэта будзе клопат медыкаў. Так, на сёння існуюць рэпрадуктыўныя тэхналогіі, але важна, каб дзеці былі Богам дадзеныя, а не тэхнічнымі сродкамі зробленыя. У ідэале, і я пра гэта кажу на ўсіх сустрэчах з моладдзю, да 30 гадоў трэба стварыць сям'ю і нарадзіць мінімум дваіх дзяцей. Потым вырашаць пытанні з работай, кар'ерай і гэтак далей, а ў 36-37 гадоў нарадзіць трэцяе дзіця. І тады ў вас будзе вечная маладосць... Моцная сям'я — вось тое галоўнае, што сёння патрэбна нашаму грамадству. Дэмаграфічнае пытанне — гэта нацыянальная бяспека краіны. Трое дзяцей — аптымальны варыянт для любой сям'і. Больш — яшчэ лепш.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

«НЕ НАШЫХ ПРАБЛЕМ НЕ БЫВАЕ»

Сямейныя гісторыі, агучаныя падчас прамой лініі, якую праводзіў член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Юрый ДЗЕРКАЧ, кранальныя і няпростыя.

Жыхарка Полацка ўжо даслала зварот у Савет Рэспублікі, аднак вырашыла заручыцца падтрымкай яшчэ і на месцы. У жанчыны, якая на пенсіі, растуць трое ўнукаў. Яе дачка па стане здароўя пазбаўлена права на выхаванне сваіх дзяцей, таму сярэдняга ўнука з другой групай інваліднасці да 18 гадоў выхоўвала бабуля. Меншы ўнук таксама рос з жанчынай у сацыяльнай кватэры, якую выдалі старэйшаму пасля паўналецця. Па словах заяўніцы, у яе з дырэктарам школы, дзе выхоўваецца меншы ўнук, узнік канфлікт. Пасля гэтага, 22 сакавіка, унука забралі органы апекі, цяпер хлопчык выхоўваецца ў прыёмнай сям'і. Галоўны аргумент сацыяльных органаў не вяртаць дзіця бабулі — яна павінна зрабіць рамонт у сваім доме і пераехаць ад старэйшага ўнука з асаблівасцямі здароўя. «Я не магу разарвацца фізічна, разумееце? Старэйшаму таксама патрэбна мая дапамога ў бытавых пытаннях. Але, калі трэба, я збяру грошай на рамонт у сваім доме. Толькі вярніце мне ўнука, на працягу сямі месяцаў хлопчык хварэе з-за стрэсу ў новай сям'і», — дзеліцца заяўніца. Па яе словах, прыёмная маці не замінае хлопчыку мець зносіны з бабуляй, Ілья заўсёды на сувязі, з ім жанчына бачыцца на выхадных. Аднак дзіця павінна расці ў сваёй сям'і разам з роднымі.

Юрый Дзеркач паабяцаў у найбліжэйшы час звязацца з органамі апекі, каб прапрацаваць гэтае пытанне з усіх бакоў, ацаніць умовы, створаныя ў дзвюх сем'ях для ўсебаковага развіцця дзіцяці і яго правільнага выхавання.

66-гадовая жыхарка гарадскога пасёлка Багушэўск Сенненскага раёна падзялілася з сенатарам сваёй шчымлівай сямейнай гісторыяй. Жанчына выхоўвала траіх дзяцей адна, двое з іх — сыны-двайняты — у 2018 годзе скончылі Лужаснянскі аграрны каледж, атрымаўшы спецыяльнасці ветфельчараў. Узнікла пытанне з абавязковым двухгадовым размеркаваннем, калі адзін з двух гадоў хлопцы ўсё ж такі змаглі адпрацаваць, то закрыць астатні тэрмін размеркавання дагэтуль не ўдаецца. У хлопцаў ёсць цяжкасці ў камунікацыі, урачы ставілі многія дыягназы, таму затрымацца ў сельскагаспадарчым калектыве надоўга ў іх не ўдаецца. «Вы ведаеце, якія людзі ёсць у сельскай мясцовасці. Сынам цяжка працаваць ва ўмовах шматзадачнасці, але яны выканаюць пастаўленую задачу, калі іх не падштурхоўваць і не крычаць. На жаль, члены калектыву гэтага не разумеюць, а некаторыя могуць і абразіць, і пакрыўдзіць. З-за стрэсу хлопцы кідаюць ужо не першае па ліку працоўнае месца, адпрацаваць апошні год не атрымліваецца», — дзеліцца жанчына.

Цяпер хлопцы перабіваюцца разавымі заробкамі, на маці пенсіённага ўзросту ляжыць фінансавае забеспячэнне ўсёй сям'і. Суд назначыў выплаціць за атрыманую хлопцамі, але не адпрацаваную адукацыю сем тысяч рублёў, ужо прыходзілі апісваць маёмасць. Жанчына ў роспачы, збіраецца шукаць дадатковы заробак да пенсіі ў 400 рублёў у Віцебску. І просіць дапамогі ў сенатара працаўладкаваць сыноў у любое месца, дзе да іх парушэнняў здароўя паставяцца з увагай.

«Гэта вельмі кранальная і складаная гісторыя. З першага погляду відаць абыякавасць да чужога гора не толькі той установы адукацыі, якая не змагла працаўладкаваць людзей у адпаведнасці з іх дыягназам, але і тых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, куды прыходзілі дзеці. Да такіх людзей трэба знайсці асаблівы падыход у калектыве, стварыць пэўныя працоўныя ўмовы для іх рэалізацыі. Гэта пытанне будзем прапрацоўваць у найбліжэйшы час, кожны жыхар нашай краіны — яе грамадзянін, які мае права на прафесійную рэалізацыю і шчаслівае жыццё. Не нашых праблем не бывае», — заключыў сенатар, паабяцаўшы дапамагчы.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,
фота аўтара.

«ДОБРАЯ СЯМ'Я СПРЫЯЕ ЗГУРТАВАНАСЦІ ГРАМАДСТВА»

Сенатар Валянцін БАЙКО падчас прамой лініі паразважаў пра галоўныя каштоўнасці

Адзін з заснавальнікаў сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Спа», член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах лічыць, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для таго, каб сям'я развівалася, мела дастатак, і толькі ад людзей залежыць, як яны гэтым скарыстаюцца. Апошнім часам да сенатара сталі звяртацца з медыцынскімі праблемамі. Валянцін Байко прыгадаў, як нядаўна з дапамогай свайго прадпрыемства дапамог адрасна набыць інвалідную каляску, а таксама слыхавы апарат. Таксама вырашаліся пытанні па набыцці лекаў. Вось і падчас чарговай прамой лініі паступіў аналагічны зварот.

Тэлефанаваў Віктар Іванавіч з Віцебскай вобласці. Як інвалід II групы па анкалагічным захворванні, сістэматычна праходзіць лячэнне прызначанымі прэпаратамі. Але апошнім часам патрэбных таблетак па месцы жыхарства не аказалася, а набыць іх, напрыклад, у сталіцы, немагчыма. Такая сітуацыя вымусіла звярнуцца па дапамогу да сенатара. Валянцін Байко зазначыў, што выпадак сапраўды сур'ёзны і сітуацыя будзе ўзята на кантроль. Як відаць, спатрэбіцца звязацца не толькі з медыцынскай установай, але пры неабходнасці і з Міністэрствам аховы здароўя.

Дарэчы, дапамога паступае не толькі па лініі зварот аў падчас прыёмаў альбо прамых ліній. Прадпрыемства, заснавальнікам якога з'яўляецца сенатар, удзельнічае ў дабрачынных акцыях, сацыяльных праектах, аказвае сістэматычную дапамогу шматдзетным сем'ям. Пры гэтым Валянцін Байко сам наведвае сем'і, уручае падарункі. Напрыклад, да 1 верасня ён пабываў з гэтай місіяй у шматдзетнай сям'і ў Ваўкавыску, дзе выхоўваюцца пяцёра сваіх і двое прыёмных дзяцей. На думку сенатара, у Беларусі робіцца ўсё магчымае, каб захаваць сямейныя каштоўнасці. У краіне нямала законаў, якія прыняты ў падтрымку мацярынства, шматдзетных сем'яў. Усё гэта сведчыць аб палітыцы сацыяльнай накіраванасці дзяржавы і аб прыярытэце традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, замацаваных у заканадаўстве.

Але ёсць і такія, якія робяць усё магчымае, каб пазбегнуць бацькоўскай адказнасці. Аб адным з іх якраз і ішла гаворка падчас чарговага тэлефоннага званка. Ён паступіў ад Вольгі Вячаславаўны з Ваўкавыска. Яе былы муж больш як год выплачвае зусім малыя аліменты на дзіця. Жанчына мяркуе, што, магчыма, муж нейкім іншым шляхам атрымлівае заработную плату і хавае свае даходы ад падатковаў інспекцыі.

— Калі бацька не хоча плаціць аліменты ў добраахвотным парадку, варта іх атрымаць праз суд, бо дзяцей трэба даглядаць і фінансава ўтрымліваць. Іншага рашэння не можа быць. Альбо мужчына плаціць сам, альбо яго да гэтага прымушаюць. На жаль, такая сітуацыя даволі распаўсюджаная. У дадзеным выпадку трэба разбірацца, якім чынам ён атрымлівае зарплату, — разважае сенатар. — Тут ёсць жорсткая ўстаноўка — зарплаты ў канвертах не павінна быць. Калі чалавек хавае даходы, ён будзе мець сур'ёзныя праблемы з праваахоўнымі структурамі, а з маральнага боку павінен усведамляць адказнасць за дзяцей як бацька, як абаронца.

Такі пасыл невыпадковы. Бо многае ў жыцці чалавека пачынаецца з сям'і, з той атмасферы, якая ў ёй пануе. Бацькі павінны любіць сваіх дзяцей і паважаць, лічыць Валянцін Байко. Сам ён — бацька траіх дзяцей, старэйшая дачка працуе на адным з ім прадпрыемстве, адзін сын — студэнт ВНУ, другі — вучань школы. Нават пры самай высокай загружанасці Валянцін Валянцінавіч знаходзіць час, каб патэлефанаваць дзецям і пацікавіцца іх жыццём. Сенатар упэўнены, што дзецям вельмі патрэбна падтрымка бацькоў. Такую аксіёму ён вынес з уласнай сям'і. У свой час яго бізнес пачынаўся як сямейны, з удзелам бацькі і брата. Цяпер да яго справы далучылася дачка. Сыны таксама не сядзяць без справы: акрамя вучобы, займаюцца спортам, вядуць актыўны лад жыцця. Сенатар упэўнены, што ў далейшым яны таксама знойдуць сабе занятак па душы, бо толькі працай можна дабіцца поспеху ў жыцці.

— Мы пачалі нашу справу з братам і бацькам, з маімі партнёрамі, з двух станкоў — сёння іх больш чым дзве тысячы, а «Контэ Спа» — самае буйное прадпрыемства на постсавецкай прасторы па вырабам панчошна-шкарпэткавай прадукцыі. І мы зрабілі гэта ў той краіне, пра якую пісалі, што тут гэта зрабіць немагчыма, што тут няма ўмоў. Але мы працавалі, дзякавалі Богу і Прэзідэнту і працавалі. Трэба працаваць, а не скардзіцца. Працы хапае. А для моладзі хачу сказаць: не варта шукаць шчасця ў чужых краінах, яно тут, побач. Развівайцеся, працуйце. Усё залежыць ад чалавека. Дзяржава толькі павінна стварыць адпаведныя спрыяльныя ўмовы, астатняе залежыць ад канкрэтнага прадпрыемства, ад той каманды, якая там працуе, — разважае сенатар.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

СЯМ'Я І ШКОЛА

Сенатару Наркевічу званілі з прапановамі па паляпшэнні ў сферы адукацыі, развіцці сельскага бізнесу, зменах у заканадаўстве

На тэматычную прамую лінію па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і да сенатара, старшыні Брэсцкага абласнога Савета Юрыя НАРКЕВІЧА, звярнуліся жыхары шэрагу раёнаў вобласці, званілі нават мінчане.

Жыхар Бярозы Сяргей Міхайлавіч лічыць, што для паляпшэння якасці жыцця многіх і многіх сем'яў у іх райцэнтры патрэбна чацвёртая па ліку школа. У сям'і самога аўтара звароту выхоўваецца трое дзяцей. Старэйшы ў гэтым годзе паступіў у ВНУ, другі ходзіць у школу, а трэці рыхтуецца стаць першакласнікам налета.

— Для такога развітога, прамысловага райцэнтра, як наш, тры школы — вельмі мала, — разважаў шматдзетны бацька. — У меншых па колькасці насельніцтва Пружанах — чатыры школы і гімназія, а ў нас — усяго тры. Школы перагружаны, працуюць у дзве змены. Адным словам, неабходнасць наспела даўно, таму прашу вас паспрыяць нейкім чынам уключэнню ў планы будаўніцтва новай школы.

Юрый Іосіфавіч цалкам пагадзіўся з заяўнікам, расказаў, якія аб'екты сацыяльнага кірунку ўзводзяцца на Брэстчыне, згадаў, як пяцігодку таму ўдалося пабудаваць цудоўны Дом культуры ў Бярозе. А цяпер, паводле слоў сенатара, настаў час прасоўваць і гэты праект — чацвёртую ўстанову адукацыі. І паабяцаў параіцца з калегамі ў прэзідыуме аблсавета, а таксама у Савеце Рэспублікі, каб як след аформіць ініцыятыву па ўключэнні ў планы на наступныя гады ўзвядзенне бярозаўскай школы.

Сярод званкоў-прапаноў, званкоў-разваг можна выдзеліць абанента з Драгічына, які вельмі занепакоены развіццём вёскі. Андрэй таксама шматдзетны бацька, пражывае ў райцэнтры, а да гэтага пяць гадоў жыў у вёсцы, спрабаваў наладзіць сваю справу. Паводле яго меркавання, бізнес не атрымаўся, бо сельскі гаспадар не можа канкурыраваць з вялікім сельгаспрадпрыемствам, таму яго маленькую гаспадарку чакала няўдача. Андрэй Сцяпанавіч лічыць, што вясковаму прадпрымальніцтву патрэбная асаблівая падтрымка, і тады вёска будзе развівацца не ў бок урбанізацыі, як гэта адбываецца цяпер, а ў бок традыцыйнага ўкладу. Вядома, разважанні былога вяскоўца нельга назваць бясспрэчнымі, але ў іх, несумненна, ёсць і рацыянальнае зерне. Чалавек занепакоены лёсам вёскі, хоча, каб не згасала жыццё ў сельскай мясцовасці, апошняе Юрый Наркевіч назваў асабліва каштоўным. Тэлефонныя суразмоўцы сышліся на тым, што Андрэй Сцяпанавіч яшчэ раз збярэцца з думкамі, пісьмова аформіць свае прапановы-разважанні і дашле іх на адрас абласнога Савета.

Сям'я мінчан, якія звярнуліся на прамую лінію, была больш катэгарычнай, чым папярэднія ўдзельнікі дыялогу. Заяўнікі патрабавалі памяняць расклад руху аднаго з рэйсавых аўтобусаў у Пружанскім раёне. Справа ў тым, што сям'я пенсіянераў з Мінска набыла дом у вёсцы побач з Ружанамі. Дабірацца туды грамадскім транспартам даволі складана. Заяўнікі расказалі, што яны едуць са сталіцы да Іванцэвічаў цягніком, затым гадзіну аўтобусам дабіраюцца да Ружан, але спазняюцца на свой рэйс, бо ў іх вёску аўтобус ужо пайшоў. Яны просяць перанесці рэйс на паўтары гадзіны пазней, каб сям'і было зручна дабірацца ў вёску. У іх таксама назапасіліся прэтэнзіі да раскладу аўтакрамы.

Сенатар і старшыня аблсавета адразу звязаўся са старшынёй Пружанскага раённага Савета Мікалаем Кудраўцом. Мікалай Пятровіч быў у курсе гэтай праблемы, з заяўнікамі камунікаваў не раз. Яны, як высветлілася, звярталіся ў многія інстанцыі, уключаючы Міністэрства транспарту. У ходзе работы са зваротам былі праведзены апытанні пасажыраў рэйса, апошнія выказаліся супраць змянення графіка. Людзям зручна выязджаць з Ружан у 13 гадзін, а не ў 14.40, як просяць заяўнікі. Больш за тое, транспартнікі падчас работы са скаргай вывучылі расклад руху транспарту і прапанавалі іншы лагістычны рад, пры якім трэба толькі выязджаць іншым цягніком з Мінска. Таму і атрымалі адмову мінчане.

Але ж яны не здаюцца і звяртаюцца ва ўсе магчымыя інстанцыі зноў. Расказвалі, што з імі жыве яшчэ састарэлая маці-інвалід, ды і самі гаспадары маюць праблемы са здароўем. Канешне, ім варта паспачуваць. Вядома, гэта іх права і іх выбар — купіць дом для адпачынку амаль за 300 кіламетраў ад сталіцы. Зразумелае і іх жаданне, каб транспарт хадзіў зручна менавіта для іх, але ж не заўсёды гэта магчыма. Расклад руху аўтобусаў у свой час складалі менавіта пад патрэбы гэтай мясцовасці. Вядома, аўтары звароту атрымаюць адказ пасля прамой лініі, але заданіць іх просьбу не ўяўляецца магчымым, ва ўсялякім разе, у найбліжэйшы час.

Былі на гэтай прамой лініі таксама прапановы па змяненні заканадаўства.

— Заканадаўства таксама мае патрэбу ва ўдасканаленні, — сказаў карэспандэнту «Звязды» Юрый Наркевіч па выніках прамой лініі. — Перад тым як ініцыяваць змены, папраўкі ў законы, хацелася б паслухаць меркаванне грамадзян, зверыць пазіцыі. Тым больш што сям'я — аснова грамадства, адзін з асноўных адрасатаў палітыкі дзяржавы. Таму і была праведзена Саветам Рэспублікі вось такая тэматычная прамая лінія, найперш, каб атрымаць пэўны зрэз грамадскай думкі. Гэта работа на будучыню.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

ПРАБЛЕМЫ ПАДОБНЫЯ — РАБОТА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ

У Гомелі прамую тэлефонную лінію па пытаннях сямейнай палітыкі і ўдасканалення заканадаўства ў сферы шлюбу і сям'і правяла член Савета Рэспублікі Ала СМАЛЯК.

Падчас прамой лініі да сенатара паступалі званкі з розных куткоў Гомельскага рэгіёна. Першай звязалася гамяльчанка Вольга Міхайлаўна. Яна маці шасцярых дзяцей. Некалькі месяцаў таму ў шматдзетную сям'ю прыйшло няшчасце.

— Першага студзеня гэтага года мой муж памёр. Нашаму старэйшаму сыну — 19 гадоў. Ён павінен быў ісці на тэрміновую службу ў армію, але ў сувязі са смерцю бацькі атрымаў адтэрміноўку. Уступілі ў спадчыну, і цяпер у нас ва ўласнасці дзве кватэры, у адной ніхто не прапісаны. Ці магчыма прапісаць сына асобна аднаго ў кватэры? Хвалююся, што яго цяпер забяруць служыць. У такім выпадку застануся сама з малодшымі, — распавяла аб сваёй сітуацыі гамяльчанка.

Сенатар запэўніла, што агучанае пытанне абавязкова вывучыць, звернецца па кансультацыю да кіраўніцтва Ваеннага камісарыята Гомельскай вобласці і звяжацца паўторна са шматдзетнай маці.

Падчас прамой лініі па кансультацыю аб магчымасці палепшыць жыллёвыя ўмовы звярнулася жыхарка Калінкавічаў. Маці непакоіцца, ці можа сям'я яе дачкі атрымаць арэнднае жыллё.

— Дачка з мужам і дзіцем чацвёрты год жывуць у Гомелі ў здымнай кватэры. Сама працуе ў школе, а муж — на прадпрыемстве. За гэты час прапанавалі толькі пакой у інтэрнаце. Як дачка можа атрымаць жыллё, калі няма магчымасці купіць кватэру нават у крэдыт? — пацікавілася Антаніна Міхайлаўна.

Жыхарка Гомельскага раёна Алена Уладзіміраўна распявала аб транспартнай праблеме, з якой кожную раніцу сутыкаецца не толькі яна, але многія ў яе населеным пункце, што пад Гомелем.

— Жывём у аграгарадку Урыцкае. На першых рэйсах, а палове сёмай, нельга выехаць на працу ў горад. Едуць студэнты, навучэнцы і тыя, хто працуе ў Гомелі — у транспарт не ўмяшчаюцца, застаюцца на прыпынку, а нарадзэ зіма. Мы не ведаем, што рабіць, — ад свайго імя і імя жыхароў аграгарадка папрасіла сенатара разабрацца ў сітуацыі жанчына.

Заяўніца нагадала, што транспарт з іх вялікага населенага пункта ходзіць у абласны цэнтр толькі адным маршрутам — з аднаго канца горада да цэнтра. Многія больш за гадзіну вымушаны з перасадкамі дабірацца пасля ў другі канец Гомеля на працу ці вучобу.

Сваёй складанай жыццёвай сітуацыяй падчас прамой лініі сенатара падзялілася гамяльчанка Таццяна — маці дзіцяці з дыягназам «аўтызм».

— Ад імя мам дзяцей з асаблівасцямі здароўя хочацца звярнуць увагу на неабходнасць нам псіхалагічнай дапамогі. Здараецца, часам рукі апускаюцца. Ці магчыма дапамога кваліфікаваных цьютараў, каб арганізаваць вольны час для такіх асаблівых дзетак? — папрасіла дапамогі заяўніца.

Сенатар звярнула ўвагу на агучаную актуальную праблему недахопу цьютараў і развіцця інклюзіўнай адукацыі дзяцей з асаблівасцямі здароўя.

— У нас ёсць цьютары, і адпаведных спецыялістаў рыхтуюць, але пакуль што не так шмат. Зразумела, што маці ў такіх выпадках неабходна дапамога ў тым ліку псіхалагічная, — пераканана член Савета Рэспублікі.

Падчас прамой лініі Алы Смаляк былі таксама ўзняты пытанні выплаты сямейнага капіталу, бясплатнага харчавання ў школе, сацыяльнай дапамогі. Усе агучаныя звароты сенатар узяла на асабісты кантроль.

— Звароты будуць разгледжаны на месцы, а пасля, калі неабходна, сумесна іх абмяркуем у Савеце Рэспублікі, — адзначыла Ала Смаляк.

Па словах сенатара, па зваротах відаць, што людзей хвалюе жыллёвае пытанне, цікавяцца жыхары Гомельшчыны дзяржаўнай падтрымкай шматдзетных сем'яў, магчымасцю атрымання арэнднага і сацыяльнага жылля.

— Традыцыйныя каштоўнасці, у прыватнасці падтрымка сям'і, заўсёды былі і застаюцца нацыянальным прыярытэтам для беларусаў. Гэта частка нашай ідэалогіі. Менавіта эфектыўная дзяржаўная палітыка па ўмацаванні інстытута сям'і і шлюбу вызначае ўзровень дабрабыту і стабільнасці грамадства. Таму ўвесь час вядзецца работа над удасканаленнем заканадаўства. Важнасць ролі сям'і ў жыцці грамадства, у выхаванні новых пакаленняў, захаванні і перадачы культурных, маральных кодаў і каштоўнасцяў, традыцый немагчыма пераацаніць. І таму ўмацаванне, развіццё і абарона правоў і інтарэсаў сям'і былі, ёсць і застаюцца ў ліку ключавых кірункаў сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліла Ала Віктараўна.

З практыкі работы са зваротамі грамадзян, як падзялілася сенатар, у кожны канкрэтны выпадак, сітуацыю, у якой апынуўся чалавек, трэба ўнікаць, бо ўсё вельмі індывідуальна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.544. Нумар падпісаны ў 19.30 17 кастрычніка 2023 года.

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

СТАРЫЯ ПАШТОЎКІ — СУЧАСНЫЯ АДРАСЫ

Дом урада, у якім размяшчалася Міністэрства культуры БССР. 1950-я гады.

Будынак, у якім знаходзіцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. 2023 год.

Філакартыст і гісторык Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ не перастае здзіўляць рознымі гісторыка-краязнаўчымі кніжнымі праектамі, дзе сучаснасць і дзень учарашні спалучаюцца, набываюць еднасць, сыходзяцца разам. А ў выніку становяцца красамоўнымі апавядальнікамі пра адметныя старонкі біяграфіі краіны, розных гарадоў і вёсак, вядомых і часам не вельмі вядомых паселішчаў...

і скарбы з розных куткоў Беларусі, каштоўныя дакументы, старадрукаваныя кнігі, слуцкія паясы, калекцыя музычных інструментаў, зброі, каштоўны фарфоравы посуд і шмат што яшчэ. Асобная ўвага аўтараў — і філіялу Нацыянальнага гістарычнага: Музею сучаснай беларускай дзяржаўнасці (вул. К. Маркса, 38, пад'езд № 4), скарбніцы, дзе захоўваюцца надзвычай цікавыя матэрыялы з сучаснай гісторыі Беларусі. У тым ліку — і мноства падарункаў Прэзідэнту нашай краіны

была гэтая мясціна ў пярэдадзень Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 годзе... На здымках — і руіны Цярэспальскіх варот у 1941-м...

Надзвычай цікавымі падаюцца раздзелы, прысвечаныя музею «Замкавы комплекс «Мір» і Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку «Нясвіж». А таксама — Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы. На старонках кнігі мы можам завітаць у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, наведаць

адкрываем і яго старонкі жыцця, існавання ў часы разбурэння... «У гады Першай сусветнай вайны палац быў разрабаваны, — чытаем на адной са старонак «Нястрачанай спадчыны», — а каштоўнасці, якія знаходзіліся ў ім, вывезены за мяжу. Пасля таго як у 1921 годзе, паводле Рыжскага мірнага дагавора, тэрыторыя Заходняй Беларусі, у тым ліку Косава, перайшла да Польшчы, у сценах палаца размясціліся адміністрацыя Косаўскай гміны і сельскагаспадарчая школа,

Мінск. Гасцініца «Еўропа». 1941 год.

Мінск. Гасцініца «Еўропа». 2020 год.

У новай працы — філакартычным альбоме «Нястрачаная спадчына» — сышліся намаганні Уладзіміра Ліхадзедава і Святланы Харужык, загадчыка аддзела інфармацыйна-выставачнай работы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Аўтары творчага праекта аб'ядналі аб'екты айчыннай культуры ў сённяшніх фатаграфічных выявах і старых паштоўках ці старых здымках, якія адлюстроўваюць іх ранейшы стан альбо ранейшы выгляд таго месца, дзе цяпер знаходзяцца музеі, установы культуры, тэатры. А таксама — знакавыя ў гісторыі краіны архітэктурныя збудаванні, праваслаўныя цэрквы, касцёлы, сядзібныя палацы...

Кніга падзелена на дзве асноўныя часткі — «Дзяржаўныя ўстановы Міністэрства культуры» і «Нястрачаная спадчына». Многія старонкі альбома адведзены Нацыянальнаму гістарычнаму музею Рэспублікі Беларусь. Створаны ў 1956 годзе як Беларускі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей, з 1992 года ён носіць назву Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, а з 15 верасня 2009 года перайменаваны ў Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. З 1965 года музей размяшчаецца па наступным адрасе нашай сталіцы: вул. К. Маркса, 12. Дарэчы, у зборы захоўваецца самая шматлікая музейная калекцыя — каля 500 тысяч адзінак, якія складаюць 21 калекцыю. Тут

ад кіраўнікоў іншых дзяржаў, знакамітых палітычных дзеячаў.

Мінчане і госці сталіцы добра ведаюць Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Якім ён быў у 1930—1950-я гг. — на старых здымках, што адлюстроўваюць і сам будынак, і яго інтэр'еры. Старыя фатаграфічныя ілюстрацыі ў спалучэнні з сучаснымі здымкамі ствараюць уражанне віртуальнага падарожжа па канкрэтных адрасах, развіваюць фантазію, дазваляюць паразважаць пра законы прасторы і часу. Калі вы будзеце ўваходзіць праз мост у Холмскія вароты Брэсцкай крэпасці-героя, то, папярэдне адкрыўшы старонкі альбома Уладзіміра Ліхадзедава і Святланы Харужык, згадайце, якой

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (а яшчэ — і яго філіял «Ласток»)... Углядаешся ў старыя і сучасныя фатаграфічныя ілюстрацыі — так і цягне пакінуць кабінетную цішыню і выправіцца ў рэальнае падарожжа!..

Філакартычны альбом «Нястрачаная спадчына» — унікальная магчымасць ажыццявіць вандроўку па ўсёй краіне. Кніга ад папярэдніх праектаў Уладзіміра Ліхадзедава адрозніваецца і нашмат большай насычанасцю гісторыка-краязнаўчай інфармацыяй. Побач з ранейшай і сённяшняй выявамі Косаўскага палаца паркавага комплексу мы даведваемся пра тое, як нараджаўся гэты ўнікальны аб'ект,

у якой навучаліся пчаляры і садоўнікі». І далей: «Падчас моцнага пажару ў 1944 годзе абрынуліся дах і ўнутраныя перакрыцці, таксама агонь канчаткова знішчыў шыкоўнае ўбранне залаў.

На працягу многіх гадоў палац быў закінуты і разбураўся пад уздзеяннем часу і прыродных з'яў. Рашэнне аб рэстаўрацыі прынята ў 2008 годзе — рамонтна-аднаўленчыя работы актыўна вядуцца на ўсім комплексе».

Знаёмства з філакартычным альбомам «Нястрачаная спадчына» дазволіць нам пабываць у Ружанскім палацавым комплексе (ён, дарэчы, быў унесены ў Спіс помнікаў БССР, якія ахоўваюцца дзяржавай, у 1953 годзе), у Гомельскім палаца-паркавым

ансамблі, Свята-Раства-Багародзічным Юравіцкім мужчынскім манастыры (знаходзіцца ў аграгарадку Юравічы Калінкавіцкага раёна, на Гомельшчыне), Лідскім замку... Даволі цікавымі падаюцца і старонкі выдання, якія расказваюць пра аб'екты, што маюць асаблівае значэнне для шматвяковай гісторыі Беларусі. Гісторыя разбурэння Навагрудскага замка налічвае ўжо стагоддзі... Горад Навагрудак быў заснаваны ў 1044 годзе князем Яраславам Мудрым. У XII стагоддзі ён стаў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага. У 1253 годзе у ім карануецца князь Міндоўг. На Замкавай гары будуецца драўляны замак... Так пачыналася замкавая біяграфія ў гэтых надзвычай багатых на гісторыю мясцінах.

Выданне «Нястрачаная спадчына», падрыхтаванае ў выдавецтве «Альфа-кніга», прыйшло да чытача з друкарскіх варштатаў ТАА «Юстмаж». Тыраж — 600 асобнікаў. Несумненна, такі своеасаблівы гісторыка-дакументальны, багаты на фатаграфічны матэрыял альбом павінен заняць сваё пачэснае месца ва ўсіх бібліятэках краіны, у ВНУ і агульнаадукацыйных школах. Паяднанне мінуўшчыны і сучаснасці, тэксты расповед і фатаграфічныя пацвярджэнні таго, што ў краіне шмат робіцца па захаванні гісторыка-культурнай матэрыяльнай спадчыны, — добры ўрок у вывучэнні гісторыі, у выхаванні юных грамадзян нашай дзяржавы. Уладзіміра Ліхадзедава і яго паплечніцу ў стварэнні кнігі-альбома, супрацоўніцу Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Святлану Харужык нельга не павіншаваць з выдатным плёнам творчай, даследчыцкай супрацы.

А чытачам, усім аматарам вывучэння гісторыі Беларусі хацелася б нагадаць пра тое, што праект лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» прадаўжаецца. І неўзабаве на паліцах айчынных кнігарняў мы ўбачым новыя альбомы і кнігі знакамітага калекцыянера старых паштовак.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Брэст. Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор. Пачатак XX стагоддзя.

Брэст. Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор. 2020 год.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 20 ноября 2023 года открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование лотов	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %)	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %)
1	**Помещение площадью 15,6 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 340/D-213112, помещение на 3-м этаже. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2. Коэффициент спроса – 2,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0	**65,91**	**65,91**
Сведения о продавце	Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76		
Срок подачи заявления	**С 18.10.2023 г. по 16.11.2023 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2,9 «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения		
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»		
Условия пользования	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств)		
Размер штрафа	Лот № 1 – 1 (одна) базовая величина согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов согласно действующему законодательству)		

Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.

Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы: юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора.

В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества.

Аукцион проводится в соответствии Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Коралл» г. Гомель (продавец) извещает о проведении 31 октября 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-61835**, общей площадью **142,7 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад цемента**. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002006010** общей площадью **5,1104 га (право аренды). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственных и административно-бытовых зданий и сооружений	**119 850,00**	11 985,00
2	**Капитальное строение с инв. № 350/С-150587**, общей площадью **418,7 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание бытовых помещений цеха №11**. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002006010** общей площадью **5,1104 га (право аренды). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственных и административно-бытовых зданий и сооружений	**158 562,00**	15 856,20
3	**Капитальное строение с инв. № 350/С-73148**, общей площадью **511,1 кв. м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **сооружение специализированное водохозяйственного назначения**. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002000345** общей площадью **0,1704 га (право аренды). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации и обслуживания отстойника цеха № 1	**54 550,00**	5 455,00

Продавец: открытое акционерное общество «Коралл» г. Гомель, 246015, г. Гомель, ул. Лепешинского, 7.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел.: **8 (044) 588-63-34 – Коваленко Галина Николаевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (открытое акционерное общество «Коралл» г. Гомель):** Р/с BY52 BPSB 3012 1118 8901 9933 0000, БИК BPSBBY2X, ОАО «Сбер Банк» г. Минск, УНП 400051785, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 октября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 27 октября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 09.08.2023 г. № 152 (30032).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 09 ноября 2023 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ»

Предмет торгов
Изолированное помещение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-708053898 общей площадью 1913,8 кв. м (наименование: административно-производственное с фотостудией; назначение: помещение многофункциональное)
Местонахождение: г. Минск, ул. Фабричная, 22-9
Начальная цена: 3 150 287,78 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 31 502,88 бел. руб.
Обременение: аренда

Продавец имущества: закрытое акционерное общество «ВИЛИЯ», ул. Фабричная, 22-9, 220033, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Вилия».

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона при условии оплаты вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в следующем порядке: 50 процентов от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение 10 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи; оставшаяся сумма оплачивается не позднее 60 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи.

Переход права собственности осуществляется после полной оплаты по договору купли-продажи.

Торги проводятся **09 ноября 2023 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.10.2023 по 08.11.2023 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (029) 623-70-80, (029) 556-14-50, (029) 159-24-94.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(029) 159-24-94 (ЗАО «ВИЛИЯ»).

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ СЛЕДУЮЩИХ ИЗМЕНЕНИЙ

в извещение о проведении 31.10.2023 года открытого аукциона **№ 4-АГ** по продаже права заключения договора аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности:
предмет аукциона № 1 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

Телефон для справок **+375 (17) 360 42 22.**
Адрес в сети Интернет: **www.mgcn.by.**

УНП 190398583

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества
ОО «АЛА» (УНП 500034202),
объявляет о проведении **30.10.2023 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме
на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

УНП 291442411

ООО «Индустрия Инноваций»
сообщает об изменении даты проведения публичных электронных торгов (аукционов) по машино-местам, расположенным по адресу: г. Минск, ул. Мястровская, 38, извещение о проведении которых опубликовано в выпуске № 110 (29990) от 10.06.2023 (стр. 15).

Подробности на сайте **https://lintorgi.by** и по тел. **+375296718395.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

АСЕННІЯ НАПАСЦІ

Як папярэдзіць сезонныя хваробы

Восень нясе нам не толькі небяспеку частых прастуд. Абвастраюцца многія хранічныя хваробы — ад гіпертаніі да астэахандрозу, хвароб суставаў, запалення нырак і нават язвы. Як зберагчы здароўе ў перыяд няўстойлівага і халоднага надвор'я, як папярэдзіць абвастрэнне хвароб, расказала ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кацярына АЗАРАВА.

ПРАСТУДА І АНГІНА — СПАДАРОЖНІКІ ВОСЕНІ

Грып як такі ў восеньскі перыяд даволі рэдкі — яшчэ не сезон. «Восеньская хвароба» — прастуда. Часта гэта адэнавірусная інфекцыя ці старая знаёмая ангіна. Абедзве яны пашкоджваюць міндаліны і насаглотку.

Сімптаматычна адэнавірус падобны на вірус грыпу, толькі радзей дае характэрныя для яго цяжкія ўскладненні. А так усё падобна — хвароба пачынаецца з павышэння тэмпературы, галаўнога болю, слабасці, мышачных боляў і зніжэння апетыту. Часам можа назірацца пачырваненне вачэй, кан'юнктывіт і павелічэнне лімфавузлоў.

Зніжаны імунітэт дае добрую глебу для рэзкага і бескантрольнага размнажэння так званых умоўна-патагенных бактэрый, якія жывуць на паднябенных міндалінах. Пачынае балець горла, падымаецца тэмпература, ломіць у суставах. Міндаліны павялічваюцца і пакрываюцца характэрным белым налётам — менавіта так заяўляе пра сябе ангіна. Лячэнне ангіны часцей за ўсё складаецца ў прыёме курса антыбіётыкаў, але адэнавірусная інфекцыя (як і іншыя рэспіратарныя вірусныя інфекцыі) іх не баіцца. Таму нельга прымаць антыбіётыкі без прызначэння спецыяліста. За гэта можна расплачвацца да канца жыцця дысбактэрыёзам або іншымі ўскладненнямі.

Вельмі важна халоднай восенню апранацца па надвор'і: цёпла, але не так, каб пад кучай адзення вы ўвесь час адчувалі сябе мокрым ад поту. Абутак павінен быць надзейны, каб раз і назаўжды выключыць непрыемную магчымасць прамачыць ногі.

Не лянуйцеся браць з сабой парасон. Адкрытая ў халоднае надвор'е шыя — лёгкая здабыча для ангіны. Ахоўвайце яе, не забываючы надзець світар з высокім каўняром ці шалік.

ЦЫСТЫТ І ЗАПАЛЕННЕ НЫРАК

Прастудзіць лёгка можна не толькі горла ці дыхальныя шляхі, але таксама ныркі і мочапалавую сістэму. Пра такія хваробы, як цыстыт або піеланефрыт часцей за ўсё мы ўспамінаем менавіта ў восеньска-зімовы перыяд. Пры гэтым цыстыт з'яўляецца «першынцам», з якога вырастае мноства запаленчых пашкоджанняў мочапалавога тракту, у тым ліку і запаленне нырак — піеланефрыт.

Цыстыт прыходзіць разам з частымі абцяжаранымі і балючымі пазывамі да мочаспускання. У такія моманты хочацца аддаць усё, каб мець магчымасць схадзіць у туалет без болю. Мача мутнее, тэмпература цела павышаецца да субфебрыльнай, пераследуе агульнае недамаганне. Запушчаная хвароба мае і хранічную форму — у перыяд рэмісіі нічога не нагадвае аб ёй, акрамя хіба што пачашчанага мочаспускання. Але пройдзе некаторы час, і перыяд абвастрэння зноў заявіць аб сабе. Гэта хвароба не любіць, калі яе запускаюць. Хваробатворныя мікробы, якія і выклікаюць цыстыт, лёгка падымаюцца па мочавыводзячых шляхах аж да нырак.

Так узнікае ўзыходзячы піеланефрыт, які па пачатковых сімптомах падобны на банальную прастуду: павышаецца тэмпература, з'яўляюцца галаўныя болі і млоснасць. Але ёсць і яркія адметныя прыкметы — болі ў вобласці паясніцы ззаду, якія аддаюць у жывот, сцягно і пахвінную вобласць. Піеланефрыт лёгка становіцца хранічным захворваннем. Ён можа ўвесь час турбаваць тупымі ныючымі болямі ў паясніцы, асабліва ў сырое халоднае надвор'е, а таксама энурэзам або балючым мочаспусканнем, як пры цыстыце.

Галоўная абарона ад цыстыту — пазбягаць пераахаладжэння. Нельга доўга сядзець у адной позе, асабліва ў халодным памяшканні, трэба пазбягаць празмерных фізічных нагрузак, нерацыянальнага харчавання, пастаяннага недасыпання, стрэсаў. Дастаткова тонкай бялізны пад міні-спаднічай, і цыстыт не прымусіць сябе чакаць.

ВЫСОКІ ЦІСК, БОЛЬ У СУСТАВАХ, ЯЗВА

У гіпертонікаў восенню свае клопаты. Неспакойнае надвор'е нясе з сабой скачкі атмасфернага ціску, і, такім чынам, павышаецца ціск артэрыяльны. Дозу неабходных лекаў даводзіцца павялічваць і быць увесь час напагатове, трымаць пад рукой танометр.

Нельга абысці ўвагай і болі ў суставах. Справа ў тым, што суставы, хоць бы аднойчы пацярпеўшы ад любога ўздзеяння (няхай гэта будзе траўма ці запаленне), становяцца больш порыстымі і пачынаюць прапускаць вільгаць. У дрэнае надвор'е вільготнасць паветра павышана, а значыць, больш раствораны у паветры вады здольна пракрасціся праз скурнае покрыва ў пашкоджаныя ўчасткі касцяной тканкі. Менавіта таму нашы косткі часам «ныюць» перад дажджом ці снегападам.

Калі вы пакутуеце на астэахандроз, восеньскія месяцы таксама не пройдуць без следу. Рэзкі боль, прастрэлы пры рухах у шыі і паясніцы могуць наведваць у некалькі разоў часцей. А выратаванне простае — не ленавацца і рабіць спецыяльную лячэбную зарадку.

Язвавая хвароба ў восеньскі перыяд таксама часта абвастраецца. Варта наведаць свайго ўрача і загадзя прыняць прафілактычнае лячэнне. Курс спецыяльных прэпаратаў дапаможа пазбегнуць непажаданага абвастрэння захворвання.

УЖЫВАЙЦЕ ПРЫРОДНЫЯ АНТЫБІЁТЫКІ

Даўно заўважана: сыты чалавек не стоміцца і не змерзне — пры ператраўліванні ежы вылучаецца гэтак неабходная арганізму цеплыня. Але энергію арганізму даюць не бялкі, а тлушчы і вугляводы. Усяго 200 грамаў ранішняй кашы з маслам дапамогуць не змерзнуць па дарозе на працу або ва ўніверсітэт.

У абед не адмаўляйце сабе ў бялковай ежы. Мяса, рыба, птушка змяшчаюць вялікую колькасць бялкоў, незаменных тлустых кіслот, вітамінаў, нарэшце, жалеза і цынку ў лёгказасваяльнай форме. Яны дапамагаюць нам умацаваць імунітэт, павысіць працаздольнасць, адчуваць сябе бадзёрымі і актыўнымі ў самае золкае надвор'е. Пры недахопе ў восеньскім рацыёне мясной ежы развіваецца анемія, з'яўляецца слабасць, дрымотнасць, зніжаюцца ахоўныя сілы арганізма. Зразумела, часовая адмова ад мяса можа аказаць дабратворны ўплыў на арганізм. Аднак восень — не самы лепшы час для вегетарыянства.

Не забывайце аб прыродных антыбіётыках — хрэне, цыбулі і часнаку. Гэтыя агароднінныя прыправы здаўна выкарыстоўваліся для барацьбы з прастуднымі захворваннямі. Хрэн змяшчае ў 5 разоў больш вітаміну С, чым цытрусавыя. Карані гэтай расліны нашпігаваныя велізарнай колькасцю цукроў, мінеральных соляў, эфірных алеяў, фітанцыдаў, утрымліваюць вітаміны групы В, нікацінавую кіслату і лізацым. Хрэн валодае бактэрыцыдным, супрацьзапаленчым дзеяннем, здольны надзейна абараніць нас ад прастуды пры рэгулярным ужыванні. Яго ядуць пры ўпадку сіл і стоме.

Цыбуля багатая на эфірныя алеі, вітаміны С і групы В, флаваноіды, жалеза і мінеральныя рэчывы. Цыбульны сок аказвае выдатнае антыбактэрыяльнае дзеянне, утрымлівае раслінныя гармоны, якія зніжаюць узровень цукру ў крыві. Для абароны ад прастуды неабходна з'ядаць палову сярэдняй сырой цыбуліны ў дзень.

Часнок валодае выдатным антыбактэрыяльным, супрацьвірусным і імунастымуляцыйным дзеяннем. З дапамогай часнаку здаўна лячылі не толькі прастуду, але і чуму, халеру, воспу. Цяпер нам вядома, што часнок валодае супрацьракавым дзеяннем, зніжае халестэрын і разрэджвае кроў.

У любую пару года старайцеся ўжываць як мага больш гародніны, ліставой зеляніны, садавіны. Папесціце сябе прысмакамі. Салодкае проста неабходна для добрага настрою і павышэння працаздольнасці ва ўмовах недахопу святла і цяпла. Шакалад, гарачая какава або пірожнае дададуць бадзёрасці і ўпэўненасці ў сабе.

ПРАВІЛЫ ЗДАРОВАГА ЛАДУ ЖЫЦЦЯ — З ДЗІЦЯЧАГА САДКА

